Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»

# Імі ганарыцца Кобрыншчына

## Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю

**Біябібліяграфічны даведнік**

2-е выданне, дапоўненае

Кобрын
2020

УДК 016:908(476.7)(092)
ББК 91.9:26.89(4Беи)
И52

Серыя заснавана ў 2017 годзе

***Складальнік:***
галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі
цэнтральнай раённай бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры
«Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» *С. Д. Курачук*

I52 **Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю** : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – 2-е выд., дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – 106 с. : каляр. іл. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

Біябібліяграфічны даведнік прысвечаны людзям, якія ўпісалі яркую старонку ў гісторыю горада Кобрына, Кобрынскага раёна, і якія былі ўдастоены звання «Ганаровы грамадзянін». Даведнік уключае інфармацыю не толькі пра ганаровых грамадзян горада і раёна, але і пра землякоў, якія сталі ганаровымі грамадзянамі іншых гарадоў.

Для шырокага кола чытачоў.

**УДК 016:908(476.7)(092)**
**ББК 91.9:26.89(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма, 2020

# ПРАДМОВА

Званне «Ганаровы грамадзянін» - найвышэйшая ўзнагарода малой радзімы. «Ганаровы грамадзянін – званне, якое ў Рэспубліцы Беларусь і некаторых іншых краінах надаецца мясцовымі органамі дзяржаўнай улады асобам за іх асабістыя заслугі перад пэўным горадам» (*Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Мінск, 1997. Т. 5. С. 20*).

У Рэспубліцы Беларусь і некаторых іншых краінах званне «Ганаровы грамадзянін» сімвалізуе выключную форму выказвання ўдзячнасці і падзякі грамадства за дзейнасць на карысць горада, раёна, забеспячэнне яго дабрабыту і працвітання. Практыка прысвойваць гэтае высокае званне існуе ў шматлікіх гарадах. Не выключэнне і горад Кобрын.

Біябібліяграфічны даведнік «Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю» прысвечаны людзям, якія ўпісалі яркую старонку ў гісторыю нашага горада, раёна, і якія былі ўдастоены звання «Ганаровы грамадзянін».

Выданне знаёміць з біяграфіямі ганаровых грамадзян, распавядае пра іх уклад у эканамічнае, сацыяльнае, культурнае развіццё горада і раёна, паказвае моладзі прыклад самаахвярнага служэння роднаму краю. Фактаграфічная інфармацыя дапоўнена біяграфічнымі даведкамі, бібліяграфічнымі звесткамі аб друкаваных публікацыях, гіперспасылкамі на інтэрнэт-рэсурсы.

Даведнік уключае інфармацыю не толькі пра ганаровых грамадзян горада Кобрына, Кобрынскага раёна, але і пра землякоў, якія сталі ганаровымі грамадзянамі іншых гарадоў, і, дарэчы, не толькі беларускіх. Таксама ў Кобрынскім раёне ёсць населены пункт, які мае ганаровых грамадзян сваёй мясцовасці, - аграгарадок Павіцце.

Матэрыял выдання згрупаваны ў наступныя раздзелы:
*Ганаровыя грамадзяне горада Кобрына;*
*Ганаровыя грамадзяне Кобрынскага раёна;*
*Ганаровыя грамадзяне аграгарадка Павіцце;*
*Ганаровыя грамадзяне-землякі іншых гарадоў;*
*Даведачна-дапаможны апарат.*

Артыкулы ў асноўных раздзелах размешчаны ў алфавіце прозвішчаў асоб. Біяграфічныя даведкі напісаны на аснове фондаў Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі з выкарыстаннем даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі, архіўных дакументаў, аўтабіяграфій, успамінаў і іншых крыніц. Тэкст паказальніка дапоўнены фатаграфіямі.

Даведачна-дапаможны апарат выдання ўключае: імянны паказальнік; геаграфічны паказальнік; храналагічны паказальнік дат прысваення звання; алфавітны спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў даведнік.

Спісы літаратуры, змешчаныя пасля біяграфічных даведак, уключаюць кнігі ў алфавітным парадку; газетныя і часопісныя артыкулы, размешчаныя ў зваротнай храналогіі іх публікацый; бібліяграфічныя выданні цэнтральнай раённай бібліятэкі; архіўныя матэрыялы, найбольш значныя электронныя рэсурсы. Амаль усе апісанні суправаджаюцца анатацыямі даведачнага характару. Мова бібліяграфічных апісанняў адпавядае мове выданняў. Анатацыі прыведзены на мове анатаванага дакумента. Адбор крыніц завершаны ў снежні 2020 года.

Бібліяграфічныя запісы ў даведніку складзены ў адпаведнасці з міждзяржаўнымі стандартамі «ГОСТ 7.1-2003 Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления», «ГОСТ 7.80-2000 Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления», метадычнымі рэкамендацыямі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Оформление библиографического списка к научной работе».

Біябібліяграфічны даведнік прызначаны шырокаму колу карыстальнікаў: настаўнікам, студэнтам, бібліятэкарам, навучэнцам, экскурсаводам, наогул усім, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, дасягненнямі людзей, якія ўнеслі значны асабісты ўклад у развіццё нашага горада, раёна, чый жыццёвы і працоўны шлях - яркі прыклад працавітасці, адказнасці, сумленнасці і прынцыповасці. Выданне заклікана абудзіць пачуццё дачынення да гісторыі і сённяшняга дня сваёй малой радзімы і краіны ў цэлым.

Даведнік «Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю» выдадзены ў Год малой радзімы ў Беларусі, што, безумоўна, надае яму асаблівую актуальнасць.

*Выказваем падзяку Дзяржаўнаму занальнаму архіву Кобрынскага раёна, кадравым службам прадпрыемстваў і арганізацый г. Кобрына, ганаровым грамадзянам і іх родным за дапамогу, аказаную пры падрыхтоўцы выдання.*

# ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ ГОРАДА КОБРЫНА

**АЛІСІЕВІЧ ФЁДАР МАКСІМАВІЧ**

**БАРЫСАЎ ДЗМІТРЫЙ КУЗЬМІЧ**

**КІРМАНОВІЧ УЛАДЗІМІР МІКАЛАЕВІЧ**

**МАРТЫНАЎ АЛЯКСЕЙ МІХАЙЛАВІЧ**

**МІЛАЯНІН ІВАН ФЁДАРАВІЧ**

**ПАДБЯРЭЗІН ІЛЬЯ МІХАЙЛАВІЧ**

**САНДАЛАЎ ЛЕАНІД МІХАЙЛАВІЧ**

**СІДАРУК ПРАСКОЎЯ СЯМЁНАЎНА**

**СЯЛЮК ПЁТР ДЗЯНІСАВІЧ**

# Р Е Ш Е Н И Е

## исполнительного комитета
## Кобринского городского Совета депутатов трудящихся

«28» июня 1974 г. № 110 г. Кобрин

**Об утверждении положения о звании «Почётный гражданин города Кобрина»**

Исполком Кобринского городского Совета депутатов трудящихся -

Р Е Ш И Л:

Утвердить положение о звании «Почётный гражданин города Кобрина».

Председатель исполкома (И. ЕЖОВ)

Секретарь исполкома (Ф. ШАТОВА)

## ПОЛОЖЕНИЕ
## о звании «Почётный гражданин города Кобрина»

1. Звание «П0ЧЁТНЫЙ ГРАЖДАНИН ГОРОДА КОБРИНА» присваивается Кобринским городским Советом депутатов трудящихся на основании ходатайства партийных, советских органов, предприятий, комсомольских, профсоюзных и других общественных организаций г. Кобрина видным партийным и государственным деятелям, рабочим, инженерно-техническим работникам, служащим, воинам Советской Армии, Авиации и Флота за активное участие в революционном движении, героизм и мужество, проявленные в борьбе на фронтах Отечественной войны, в партизанских отрядах и антифашистском подполье, при защите и освобождении города Кобрина и области, за заслуги в развитии строительства г. Кобрина, в коммунистическом воспитании трудящихся и наведении образцового общественного порядка.

2. Посвящение в Почётные граждане производится на сессии городского Совета депутатов трудящихся, на массовых городских праздниках, посвященных историко-революционным датам, трудовым успехам трудящихся города в каждом отдельном случае по специально разработанному ритуалу. Почётному гражданину вручается диплом, Лента почёта и его имя заносится в Книгу Почётных граждан города.

3. Чествование Почётного гражданина широко пропагандировать среди населения города и района через газету «Коммунистический труд» и местное радиовещание. О каждом Почётном гражданине издается массовым тиражом листовка для клубов, ленинских комнат и красных уголков, для молодежных и школьных музеев революционной, боевой и трудовой славы советского народа.

4. Портреты Почётных граждан помещаются на стендах музеев города, в аллее Почётных граждан, в парке культуры и отдыха.

5. Почётному гражданину предоставляется право посадить дерево в аллее Почётных граждан в парке культуры и отдыха.

6. Почётные граждане приглашаются на торжественные собрания и заседания, на трибуну во время городских митингов и демонстраций трудящихся, для участия в закладке фундаментов общественных зданий, памятников, стадионов, парков и др.

7. На доме, в котором проживает Почётный гражданин, закрепляется мемориальная табличка с надписью «В этом доме в квартире № ______ живет Почётный гражданин ________________________».

8. Экскурсоводам по городу вменяется в обязанность рассказывать туристам и журналистам о Почётных гражданах города Кобрина.

<table>
<tr><td>Кобринский городской Совет депутатов трудящихся</td><td colspan="2"></td><td></td></tr>
<tr><td>УДОСТОВЕРЕНИЕ № _________<br>Предъявитель тов.</td><td rowspan="3"></td><td rowspan="3">место<br>для<br>фото</td><td rowspan="3"></td></tr>
<tr><td>является</td></tr>
<tr><td rowspan="2">Почётным гражданином города Кобрина<br>Председатель исполкома Кобринского городского Совета депутатов трудящихся<br>Секретарь исполкома</td></tr>
<tr><td colspan="3">Собственноручная подпись<br><br>_________________________</td></tr>
</table>

*узор пасведчання Ганаровага грамадзяніна г. Кобрына*

Секретарь исполкома (Ф. ЮМАТОВА)

*Даведка*

# Званне
# «Ганаровы грамадзянін горада КОБРЫНА»

**прысвойваецца Кобрынскім гарадскім Саветам дэпутатаў працоўных на падставе хадайніцтва партыйных, савецкіх органаў, прадпрыемстваў, камсамольскіх, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацый горада Кобрына выдатным партыйным і дзяржаўным дзеячам, рабочым, інжынерна-тэхнічным работнікам, воінам Савецкай арміі, Авіяцыі і Флоту за актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху, гераізм і мужнасць, праяўленыя ў барацьбе на франтах Айчыннай вайны, у партызанскіх атрадах і антыфашысцкім падполлі, пры абароне і вызваленні горада Кобрына і вобласці, за заслугі ў развіцці будаўніцтва г. Кобрына, у камуністычным выхаванні працоўных і навядзенні ўзорнага грамадскага парадку.**

# АЛІСІЕВІЧ
# ФЁДАР МАКСІМАВІЧ

**АЛІСІЕВІЧ Фёдар Максімавіч** (1917–1975) - Ганаровы грамадзянін горада Кобрына.



Нарадзіўся ў 1917 годзе ў в. Каўпыніца (цяпер в. Колас) Крупскага раёна Мінскай вобласці.

Закончыў гістарычны факультэт Аршанскага настаўніцкага інстытута.

З кастрычніка 1939 года да кастрычніка 1940 года служыў у Чырвонай арміі.

У красавіку - кастрычніку 1943 года вучыўся ў Беларускай школе падрыхтоўкі партызанскіх кадраў на станцыі Сходня Хімкінскага раёна Маскоўскай вобласці.

У кастрычніку 1943 года быў закінуты ў Кобрынскі раён для арганізацыі падпольнай барацьбы, прызначаны памочнікам камісара партызанскай брыгады імя Чапаева, адначасова з'яўляўся сакратаром Кобрынскага раённага падпольнага камітэта ЛКСМБ.

З сакавіка 1945 да снежня 1950 года Фёдар Максімавіч працаваў у апараце Брэсцкага абкама ЛКСМБ, пазней Брэсцкага абкама КПБ.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Званне «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына» Алісіевіч Фёдар Максімавіч удастоены ў 1964 годзе (рашэнне гарадскога райвыканкама № 203 ад 18.07.1964 г.)

### *Аб жыцці і дзейнасці*


**Алісіевіч Фёдар Максімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 213. - (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

**Долготович, Б. Д**. Алисиевич Федор Максимович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 30.

**Алісіевіч Фёдар Максімавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі: інжынер-праграміст П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 9.

**Алисиевич Федор Максимович** // Список почетных граждан города Кобрина / отдел идеологической работы Кобринского райисполкома. – Кобрин, 2002. – С. 4.

**Почётные** граждане города Кобрина и Кобринского района. **Алисиевич Федор Максимович** [Электронный ресурс] // Туристический Кобрин. – Режим доступа: http://ikobrin.ru/gragdane.php. – Дата доступа: 15.09.2019.

# БАРЫСАЎ
# ДЗМІТРЫЙ КУЗЬМІЧ

**БАРЫСАЎ Дзмітрый Кузьміч** (1911–1975) - Ганаровы грамадзянін горада Кобрына.



Ураджэнец расійскай вёскі з прыгожай назвай Ясенкі Тульскай вобласці.

Да службы ў арміі Дзмітрый Барысаў працаваў на шахце ў горадзе Анжэра-Суджэнску Кемераўскай вобласці.

У 1929 годзе быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі, дзе і праслужыў да 1956 года.

Вялікую Айчынную вайну сустрэў пад горадам Сумы (Украіна) у складзе 20-й арміі. Быў начальнікам штаба зенітнага дывізіёна з ліпеня 1941 па ліпень 1943 года.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Дзмітрый Кузьміч займаў высокія камандныя пасады. У 1943 годзе ён стаў камандзірам палка № 1282 зенітна-артылерыйскіх часцей 61-й арміі. У ліпені 1944 года полк прымаў удзел у вызваленні Кобрына, за што ў 1974 годзе Дзмітрыю Барысаву прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына».

Д. К. Барысаў узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, дзевяццю медалямі. Цяпер яго ўзнагароды і асабістая зброя (маўзер) захоўваюцца ў Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя. А. В. Суворава.

Пасля вайны Дзмітрый Кузьміч Барысаў жыў у Маскве, дзе і памёр у жніўні 1975 года.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Долготович, Б. Д.** Борисов Дмитрий Кузьмич / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 30.

**Барысаў Дзмітрый Кузьміч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 10-11.

**Курашова, Л.** Московские гости на кобринской земле / Лидия Курашова // Кобрин-информ. - 2014. - 24 июля. - С. 7.

О Дмитрие Кузьмиче Борисове, Почётном гражданине г. Кобрина.

**Курашова, Л.** «Здешняя земля начинена осколками мин и снарядов, обильно полита кровью наших солдат…» / Лидия Курашова // Кобрынскі веснік. – 2014. - 19 ліпеня. – С. 3.

Воспоминания участников освобождения Кобрина от фашистской оккупации, в т. ч. воспоминания Дмитрия Кузьмича Борисова.

**Курашова, Л.** Посетить город, который освобождал дед / Лидия Курашова // Кобрынскі веснік. – 2014. – 26 ліпеня. – С. 4.

Сотрудники музея принимали в своих стенах внучку Дмитрия Кузьмича Борисова, полковника, командира 1282-го зенитно-артиллерийского полка, одного из освободителей Кобрина.

**Дзмітрый Кузьміч Барысаў** // Кобрынскі веснік. – 2002. – 20 ліпеня.

**Борисов Дмитрий Кузьмич** // Список почетных граждан города Кобрина / отдел идеологической работы Кобринского райисполкома. – Кобрин, 2002. – С. 1.

**Борисов Дмитрий Кузьмич** [Электронный ресурс] // Бессмертный полк. – Режим доступа: https://cdn.moypolk.ru/soldier/borisov-dmitriy-kuzmich. – Дата доступа: 29.05.2020.

# КІРМАНОВІЧ УЛАДЗІМІР МІКАЛАЕВІЧ

**КІРМАНОВІЧ *Уладзімір Мікалаевіч*** (1919–2001) - Ганаровы грамадзянін горада Кобрына.



Нарадзіўся 5 лістапада 1919 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці ў сям'і рабочых.

У 1926 годзе паступіў вучыцца ў Кобрынскую павятовую школу (цяпер СШ № 2 г. Кобрына). Пасля заканчэння сямігодкі Уладзіміра, як дзіця з беднай сям'і, узялі да сябе на навучанне каталіцкія манахі, якія ў адной з хат па вуліцы Першамайскай арганізавалі сталярную майстэрню.

У 1939 годзе пасля прыходу ў Заходнюю Беларусь савецкай улады Уладзімір Кірмановіч быў прызваны на тэрміновую службу ў рабоча-сялянскую Чырвоную Армію. Восем месяцаў (з кастрычніка 1939 па чэрвень 1940) служыў у Ленінградскай вобласці, удзельнічаў у Фінскай вайне.

Закончыў курсы малодшых лейтэнантаў у 1942 годзе. З 1943 года – член КПСС.

У гады Вялікай Айчыннай вайны У. М. Кірмановіч камандаваў знішчальнай процітанкавай батарэяй на Бранскім, Цэнтральным, 3-м і 4-м Украінскіх, 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх франтах.

22 жніўня 1944 года ў час варожай танкавай атакі батарэя капітана Кірмановіча першая прыняла ўдар, у жорсткім баі падбіла і спаліла 14 варожых танкаў. За мужнасць, гераізм, праяўленую ініцыятыву, якая вызначыла зыход бою, Уладзімір Кірмановіч у 1945 годзе быў удастоены Зоркі Героя, звання Героя Савецкага Саюза.

Шматлікія заслугі Кірмановіча ў гады Вялікай Айчыннай вайны адзначаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Аляксандра Неўскага, двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Айчыннай вайны II ступені, трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі і шматлікімі медалямі.

Пасля вайны У. М. Кірмановіч пражываў у Аўстрыі і Румыніі. Вярнуўшыся з-за мяжы, нядоўга разам з сям'ёй жыў у Кобрыне.

У 1950 годзе пераехаў у Ленінград, дзе паступіў на курсы падрыхтоўкі ў лётную акадэмію, а потым у ваенна-авіяцыйную акадэмію імя М. В. Фрунзе ў Маскве.

У 1955 годзе Кірмановіч закончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе.

У 1956 годзе пасля заканчэння вучобы пераехаў у Харкаў. Жыццё У. М. Кірмановіча ў Харкаве звязана з Харкаўскім вышэйшым ваенным вучылішчам лётчыкаў імя двойчы Героя Савецкага Саюза С. І. Грыцаўца. У гэтым вучылішчы Уладзімір Мікалаевіч доўгія гады працаваў выкладчыкам на кафедры тактыкі. У 1958 годзе Уладзіміру Мікалаевічу прысвоена званне палкоўніка.

У 1975 годзе ў званні палкоўніка і на пасадзе намесніка начальніка па страявой падрыхтоўцы У. М. Кірмановіча камісавалі. Але сыходзіць на заслужаны адпачынак ён зусім не збіраўся. З 1975 года амаль да смерці палкоўнік у адстаўцы Кірмановіч працаваў у сваім лётным вучылішчы ў лабараторыі тэхнічных сродкаў навучання.

За 45 гадоў, праведзеных у Харкаве, Уладзімір Мікалаевіч не раз наведваў родны Кобрын, дзе жылі яго родныя і сябры.

У 1987 годзе У. М. Кірмановічу было прысвоена званне Ганаровага грамадзяніна горада Кобрына (рашэнне Кобрынскага гарадскога Савета народных дэпутатаў № 237 ад 15.09.1987).

Герой Савецкага Саюза, першы і адзіны выхадзец Кобрыншчыны, які атрымаў такое высокае званне, палкоўнік У. М. Кірмановіч памёр 5 лютага 2001 года. Заслужаны і адданы вайсковай службе чалавек пахаваны на алеі герояў у Харкаве.

Жыццёвы подзвіг Уладзіміра Мікалаевіча і ў ваенны, і ў мірны час - прыклад беззапаветнага служэння Айчыне, узор для пераймання шматлікім пакаленням кабрынчан.

На малой радзіме У. М. Кірмановіча памятаюць, паважаюць яго імя, навечна захаванае ў назвах вуліц, галерэях Славы, музейных экспазіцыях і простай чалавечай памяці тых, хто яго ведаў.

12 кастрычніка 2005 года на сесіі раённага Савета дэпутатаў было прынята рашэнне аб прысваенні вуліцы ў квартале індывідуальнай забудовы на тэрыторыі былога ваеннага гарадка імя земляка-героя У. М. Кірмановіча.

На будынку сярэдняй школы № 2 г. Кобрына, у якой вучыўся У. М. Кірмановіч, устаноўлена мемарыяльная дошка.

Для роднага Кобрына Уладзімір Мікалаевіч Кірмановіч назаўжды застанецца Ганаровым грамадзянінам і адзіным мясцовым Героем Савецкага Саюза. З пакалення ў пакаленне на Кобрыншчыне перадаецца памяць пра героя, які прымножыў славу нашай зямлі.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**О присвоении** звания Почетных граждан города Кобрина **Кирмановичу Владимиру Николаевичу** : решение Кобринского городского Совета народных депутатов, 15.09.1987, № 237 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 4. Д. 149. Л. 14.

**Долготович, Б. Д.** Кирманович Владимир Николаевич / Б. Д. Долготович, А. А. Коваленя // Созвездие героев земли белорусской / Б. Д. Долготович, А. А. Коваленя. – Минск, 2019. - С. 156-157.

**Долготович, Б. Д.** Кирманович Владимир Николаевич / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов : биографический справочник / Б. Д. Долготович. – Минск, 2008. – С. 30-32.

**Залатая** зорка Кобрына. **Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 239 : фота.

**Их подвиг** и труд награждены звездой Героя. **Владимир Николаевич Кирманович** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. - Т. 8. – С. 280.

**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Минск, 1972. – Т. 5. – С. 590 : фота.

**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1997. - Т. 4. – С. 181.

**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945 : энцыклапедыя. – Мінск, 1990. – С. 264.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. – Минск, 1982. – Т. 5. Биографический справочник. – С. 286.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. – Т. 1. Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 454, 517.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2007. – Т. 4. – С. 48.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Героическая Брестчина / сост. С. Ф. Омелюсик. – Брест, 2015. - С. 16.

**Кирманович Владимир Николаевич** // От парада надежды к Параду Победы. 7 ноября 1941 г., 16 июля 1944 г., 24 июля 1948 г. / сост. : Б. Д. Долготович, М. Г. Никитин. – Минск, 2015. – С. 22, 176.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Твои сыновья, Беларусь! Герои Советского Союза : биографический справочник. – Минск, 2015. – С. 65.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Навечно в сердце народном.- Минск, 1977. - С. 200.

**Кирманович Владимир Николаевич** = **Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси. – Мінск, 2010. – С. 516-517.

**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі: інжынер-праграміст П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 11-14.

**100 гадоў** з дня нараджэння У. М. Кірмановіча (1919) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 100-101.

**Вуліца** Кірмановіча // Думаць пра жывых, памятаць пра загінуўшых» : дадатак да даведніка аб вуліцах Кобрына, якія носяць імены ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук. – Кобрын, 2005. - 4 с.

**Елизарова, Ж.** Приказ выполнил / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2020. – 8 мая (№ 35). – С. 9 : фот.

Об уроженце Кобринщины Герое Советского Союза В. Н. Кирмановиче.

**Курачук, С.** Залатая зорка Кобрына / Святлана Курачук // Кобрынскі веснік. – 2019. – 6 лістапада. – С. 5.

У рамках праекта Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі аб славутых земляках краю - матэрыял да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Кірмановіча.

**Курачук, С.** Золотая звезда Кобрина / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2019. – 31 октября (№ 44). – С. 4.

В рамках проекта Кобринской центральной районной библиотеки - материал к 100-летию со дня рождения Владимира Кирмановича.

**Свиридюк, Д**. Мой прадедушка – Владимир Кирманович / Диана Свиридюк // Кобрынскі веснік. – 2015. – 15 красавіка. – С. 3.

Рассказ внучки о двоюродном прадедушке В. Н. Кирмановиче, Герое Советского Союза.

**Свиридюк, Д**. Мой прадедушка – Герой Советского Союза / Диана Свиридюк // Заря. – 2015. – 23 апреля. – С. 6.

Рассказ внучки о двоюродном прадедушке В. Н. Кирмановиче, Герое Советского Союза.

**Фридлендер, Н.** «Нет героев от рожденья, они рождаются в боях…» / Наталья Фридлендер // Кобрин-информ. – 2014. – 17 июля. – С. 11.

О Героях Советского Союза – *В. Кирмановиче,* А. Морозове.

**Курига, Е.** Золотая звезда Кирмановича // Кобрин-информ. – 2008. – 2 ноября. – С. 3.

**Мурашкина, М.** Имена земляков – улицам города / Мария Мурашкина // Кобрынскі веснік. – 2005. – 22 кастрычніка.

**Кобрына** ганаровыя грамадзяне. Уладзімір Мікалаевіч Кірмановіч // Кобрынскі веснік. – 2002. – 20 ліпеня.

**Кирманович Владимир Николаевич** : некролог // Кобрынскі веснік. – 2001. – 10 лютага.

**Кірмановіч У. М.** // Героі Савецкага Саюза і Беларусі – ураджэнцы Брэстчыны : партрэты-плакаты. – Брэст, 1999.

**Владимир Николаевич Кирманович** [Электронный ресурс] // Кобринский районный исполнительный комитет. – Режим доступа: http://kobrin.brest-region.gov.by. – Дата доступа: 01.03.2019.

**Кирманович Владимир Николаевич** [Электронный ресурс] // Википедия : свободная энциклопедия. - Режим доступа: http://ru.wikipedia.org/wiki/ Кирманович,_ Владимир_Николаевич/ - Дата доступа: 04.04.2019.

**Кирманович Владимир Николаевич** [Электронный ресурс] // Герои страны. - Режим доступа: http:// www. warheroes. ru/hero/. - Дата доступа: 14.04. 2019.

**Мемориальная** доска Кирмановичу [Электронный ресурс] // Туристический Кобрин. – Режим доступа: http://ikobrin.ru/kobtur-kirma.php. – Дата доступа: 14.04. 2019.

# МАРТЫНАЎ
# АЛЯКСЕЙ МІХАЙЛАВІЧ

У кожнага горада ёсць свае запаветныя імёны, якія ніколі не забываюцца. Яны, як зоркі на небасхіле, ззяюць доўга і прыгожа, з'яўляюцца ўзорам служэння Айчыне і бліжняму. Для кабрынчан такой пуцяводнай зоркай стаў **Аляксей Міхайлавіч МАРТЫНАЎ** (1904–1999).



У нашым рэгіёне, увогуле на Брэстчыне і ў рэспубліцы, яго імя добра вядома як імя чалавека - даследчыка гісторыі Кобрыншчыны, збіральніка рэдкіх дакументаў аб яе мінулым, першага і шматгадовага дырэктара музея імя А. В. Суворава, арганізатара і першага загадчыка гарадской бібліятэкі.

Шматлікія публікацыі А. Мартынава выявілі яго як яркага публіцыста, улюблёнага ў родны край, яго гісторыю, прыроду і чалавека працы, абуджалі гэтыя высакародныя пачуцці ў падрастаючых пакаленняў.

Аляксей Міхайлавіч Мартынаў нарадзіўся 7 жніўня (20 жніўня па новым стылі) 1904 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці ў сям'і народнага настаўніка. У 1911 годдзе яго аддалі вучыцца ў Кобрынскае прыходскае вучылішча. Потым ён прадоўжыў навучанне ў рэальным вучылішчы. У 1920-1921 гадах Аляксей Міхайлавіч стаў выкладчыкам лікбеза, працаваў настаўнікам.

Пасля смерці бацькі клопат пра маці і малодшых дзяцей, пастаянная цяжкасць са сродкамі не дазволілі маладому чалавеку пайсці вучыцца далей. Аляксей Мартынаў працаваў рабочым пераважна на сезонных работах і на лесазаводзе, потым займаўся садоўніцтвам на прысядзібным участку. Але імкненне стаць пісьменным было настолькі моцным, што ён заняўся самаадукацыяй. Яго цікавасць і захапленні былі выключна шырокімі, ахоплівалі розныя галіны ведаў.

Аляксей Міхайлавіч самастойна вывучаў і добра валодаў англійскай, французскай, нямецкай, польскай і ўкраінскай мовамі, асвоіў эсперанта, добра маляваў. Апрача мовазнаўства, захапляўся чытаннем твораў класікаў сусветнай літаратуры. Самастойныя пробы пяра ўвянчаліся з'яўленнем шэрагу цікавых апавяданняў і аповесці.

А. М. Мартынаў быў арганізатарам і першым загадчыкам гарадской бібліятэкі ў Кобрыне. У 1939 годзе, а потым у першыя дні вызвалення Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Мартынаў многа зрабіў для таго, каб у найкарацейшы тэрмін наладзіць адпаведную работу бібліятэкі.

Са жніўня 1946 года Аляксей Міхайлавіч назначаны дырэктарам Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава. Толькі дзякуючы стараннямі энтузіязму Мартынава домік Суворава, які дастаўся яму ў даволі сумным стане, не толькі ацалеў, але і стаў візітнай карткай Кобрына, атрымаў вядомасць за межамі Беларусі.

Трыццаць два гады Аляксей Міхайлавіч аддаваў сябе любімай справе, даследаваў мінулае роднага горада, напісаў больш за 70 артыкулаў, публікаваўся ў рэспубліканскіх і мясцовых органах друку.

А. М. Мартынаў пабываў у шэрагу краін, больш чым у 150 гарадах, выкарыстоўваў здабытыя звесткі і экспанаты для папаўнення музея. Бясцэнныя рэквізіты, дакументы, экспанаты дырэктар музея прывозіў у рэчавых мяшках, чамаданах у агульных вагонах цягнікоў.

З 1965 па 1972 год А. М. Мартынаў на грамадскіх пачатках узначаліў Кобрынскае аддзяленне добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Ён не толькі праводзіў работу па захаванні наяўных помнікаў, але таксама ініцыіраваў працу па ўвекавечанні месцаў, звязаных з гістарычнымі падзеямі на тэрыторыі Кобрыншчыны.

У 1974 годзе да трыццацігоддзя вызвалення Беларусі па ініцыятыве Аляксея Міхайлавіча і пры яго непасрэдным удзеле было ўстаноўлена 24 абеліскі з мемарыяльнымі дошкамі, прысвечанымі падзеям Вялікай Айчыннай вайны.

Па яго ініцыятыве ў 1948 годзе ў Кобрыне быў заснаваны парк культуры і адпачынку імя А. В. Суворава, першы дырэктар якога В. І. Харытанюк быў блізкім сябрам Аляксея Міхайлавіча. Дзякуючы актыўнай дзейнасці А. М. Мартынава ў 1964 годзе ў Кобрыне быў устаноўлены помнік Сувораву работы В. С. Чабатарова.

Мартынаў дасканала ведаў сусветную гісторыю і гісторыю Кобрыншчыны. Нездарма яго артыкулы сталі першакрыніцамі па вывучэнні і асэнсаванні мінулага роднага краю. Аляксей Міхайлавіч правёў вялікую работу па ўстанаўленні даты першага пісьмовага ўпамінання аб горадзе Кобрыне.

Высокі інтэлект, дыпламатычнасць, уменне аб’ектыўна ацаніць магчымасці кожнага чалавека, тактоўнасць у зносінах, тонкі гумар, а часам і лёгкая іронія прыцягвалі да яго людзей.

Аляксей Міхайлавіч памёр 15 лістапада 1999 года. За актыўную краязнаўчую работу ён узнагароджаны медалём імя Н. К. Крупскай, мноствам грамат, імяннымі падарункамі.

У 1997 годзе А. М. Мартынаў удастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына» (рашэнне Кобрынскага гарадскога выканаўчага камітэта № 534 ад 16.09.1997).

Гісторыя нашага горада багата падзеямі, якія ў свой час даследаваў Аляксей Міхайлавіч Мартынаў і з уласцівай яму лёгкасцю адлюстроўваў на бумазе. Аб гэтым яскрава сведчыць спіс крыніц, які ўключае работы А. М. Мартынава.

### *Працы*

**Мартынаў, А. М.** Бежанская эпапея / А. М. Мартынаў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 78-79.

**Мартынаў, А. М.** Дняпроўска-Бугскі канал / А. М. Мартынаў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 419-420.

**Мартынаў, А. М.** З гісторыі аховы здароўя на Кобрыншчыне / А. М. Мартынаў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка.– Мінск, 2002. – С. 134-136.

**Мартынаў, А. М.** З успамінаў / А. М. Мартынаў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – – Мінск:, 2002. – С. 396-397.

**Мартынаў, А. М.** Кобрынская пошта / А. М. Мартынаў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 417-419.

**Мартынаў, А. М.** Кобрынскі замак / А. М. Мартынаў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 39-40.

**Мартынаў, А. М.** Мартыралог кобрынскага яўрэйства / А. М. Мартынаў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 152-153.

**Мартынов, А.** Старейшие профессии Кобринщины : история / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2011. – 28 апреля. – С. 6 ; Кобрынскі веснік. – 2011. - 20 студзеня.

Почтальон, комиссионеры, паны, хлебопеки, паробки, повивальные бабки.

**Мартынов, А.** Старейшие профессии Кобринщины / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2011. – 27 января. – С. 6.

Прачки, кузнецы, балагулы.

**Мартынов, А.** Старейшие профессии Кобринщины / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2011. – 10 февраля. – С. 6.

**Мартынов, А.** Вымершие и умирающие профессии : история / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2010. – 1 июля. – С. 6.

**Мартынов, А.** Непростая судьба главного памятника города : исторические памятники Кобринщины / А. Мартынов // Кобрин-информ. - 2010. – 16 сентября. – С. 6.

**Мартынов, А.** Под гнетом свастики : история / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2010. – 18 марта, 15 апреля, 6 мая.

Великая Отечественная война на Кобринщине.

**Мартынов, А.** Профессии прошлого / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2010. – 16 сентября. – С. 6.

**Мартынов, А.** Старейшие профессии Кобринщины ; Умершие и умирающие профессии : история / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2010. – 14 октября. – С. 6.

**Мартынов, А.** Судьбоносный 1939 : история / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2010. – 6 января. – С. 6.

**Мартынов, А.** Так начиналась война: история / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2010. – 11 февраля. – С. 6.

1941 год на Кобринщине.

**Мартынов, А.** Войны в истории Кобринщины / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2009. – 12 февраля, 12 марта.

**Мартынов, А.** Кобринщина на географических картах / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2009. – 8 января. – С. 6.

**Мартынов, А**. Помнит Брестчина 1812 год: история / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2009. – 14 мая. – С. 26.

**Мартынов, А.** Потерянное двадцатилетие : история / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2009. – 15 октября, 10 декабря.

**Мартынов, А.** Потерянное двадцатилетие : к 70-летию воссоединения Западной Беларуси с БССР / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 2009. – 8 красавіка. – С. 4.

**Мартынов, А.** На переломе веков: история / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2009. – 11 июня. – С. 26.

Кобрин в конце XIX – начале XX веков.

**Мартынов, А.** Религия в жизни Кобринщины : история / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2009. – 12 марта, 2 апреля.

**Мартынов, А.** Чем жили раньше кобринчане?.. : рукописи не горят / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 2002. – 28 снежня.

**Мартынов, А.** Кому дарили Кобрин? : рукописи не горят / Алексей Мартынов // Кобрынскі веснік. – 2002. – 14 жніўня. – С. 3.

**Мартынов, А.** Беженская эпопея: страницы истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1999. – 28 красавіка, 19 мая, 26 мая, 9 чэрвеня.

Как отразилась Первая мировая война на судьбах жителей Кобринщины начала XX столетия.

**Мартынов, А.** Кобринские гербы / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1998. – 23 верасня.

**Мартынов, А.** Кобринское действо : страницы истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1997. – 8 мая, 14 мая, 21 мая.

Об отправке Суворова из Кобрина в ссылку.

**Мартынов, А.** О земле-кормилице…: страницы истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1997. – 19 лістапада, 26 лістапада; 10 снежня, 13 снежня, 20 снежня, 24 снежня; 28 студзеня, 31 студзеня.

О характере земельных отношении и землепользования на Кобринщине с начала XX века и до наших дней.

**Мартынов, А.** «Одумерщина» : страницы нашей истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1997. – 6, 13 жніўня.

О водной артерии нашего города – реке Мухавец.

**Мартынов, А.** Свидетель нашей истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1997. – 12 красавіка. – С. 2.

Спасский монастырь.

**Мартынов, А.** Суворовский манёвр через годы…: между прошлым и будущим / Алексей Мартынов // Буг. СЭЗ Брест. – 1997. - № 4. – С. 46-47.

К 50-летию Кобринского военно-исторического музея имени А. В. Суворова.

**Мартынов, А.** Сумбурные заметки о земле-кормилице Кобринщины : страницы истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1997. – 6 верасня, 10 верасня, 27 верасня; 8 кастрычніка, 15 кастрычніка, 18 кастрычніка, 22 кастрычніка.

**Мартынов, А.** Три юбиляра : страницы истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1997. – 4 студзеня, 11 студзеня, 22 студзеня, 29 студзеня; 5 лютага.

**Мартынов, А.** Впору бить тревогу, или Как же дошли мы до жизни такой? / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1996. – 6 студзеня. – С. 2.

Книготорговое дело в Кобрине.

**Мартынов, А**. Первая «Просвита» в Кобрине / Алексей Мартынов // Берестейський край. – 1996. – березень. – С. 3.

В конце двадцатых годов в Кобрине возникло украинское культурно-просветительное общество «Просвита».

**Мартынов, А.** Полонизация, русификация и прочие «зации» : история глазами современника / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1996. – 1 лютага, 21 лютага, 28 лютага; 2 сакавіка, 6 сакавіка, 23 сакавіка, 27 сакавіка; 6 красавіка, 10 красавіка, 17 красавіка, 25 красавіка, 18 мая, 22 мая, 15 чэрвеня.

**Мартынов, А.** Старые казармы: страницы истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1996. – 21 жніўня.

**Мартынов, А.** Умолчание зазорно, или Загубленный мемориал / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1994. – 23 лістапада. – С. 2.

Воинские кладбища Первой мировой войны.

**Мартынов, А.** Довоенные улицы Кобрина : страницы истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1993. – 9 студзеня. – С. 2.

**Мартынов, А.** Конец «мещанских» улиц / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1993. – 5 чэрвеня, 9 чэрвеня, 12 чэрвеня.

**Мартынов, А. «**Мещанская улица» : старонкі гісторыі / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1993. – 17 красавіка, 21 красавіка.

**Мартынов, А.** Памяти кобринского еврейства : страницы истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1993. – 27, 30 студзеня.

**Мартынов, А.** Рождественские святки в древнем Кобрине / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1993. – 6 студзеня. – С. 2.

**Мартынов, А.** Так создавался музей / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1993. – 10 сакавіка, 13 сакавіка, 17 сакавіка.

**Мартынов, А.** Юбилярам – 430: страницы истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1993. – 26 чэрвеня.

**Мартынов, А.** Это наша история / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1991. – 22 студзеня.

О судьбах исторических памятников Кобрина.

**Мартынаў, А.** Дык якім быў замак? : старонкі гісторыі / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1990. – 23 жніўня. – С. 2.

Кобрынскі замак (1597 г.)

**Мартынаў, А**. Кобрынскія кірмашы : з гісторыі горада / А. Мартынаў**//** Камуністычная праца. – 1990. – 17 сакавіка. – С. 2–3.

**Мартынаў, А.** Крык душы, або Трыумф публічнасці : вяртаючыся да надрукаванага / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1990. – 20 лютага. - С. 2.

**Мартынаў, А.** На паверхні і ў глыбіні : ці будуць у Кобрыне археалагічныя раскопкі? / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1990. – 26 мая.

**Мартынаў, А.** Рэлігія ў жыцці Кобрыншчыны / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1990. – 15 мая, 17 мая, 19 мая.

**Мартынаў, А.** У Кобрыне 70 гадоў назад : старонкі гісторыі / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1990. – 31 ліпеня.

Падзеі савецка-польскай вайны 1919-1920 гг. на Кобрыншчыне.

**Мартынаў, А.** Уладатрымальнікі : старонкі гісторыі / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1990. – 27 сакавіка. – С. 2-3.

**Мартынаў, А.** Унія на Кобрыншчыне: старонкі гісторыі / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1990. – 6 студзеня.

**Мартынаў, А.** Знамянальная гадавіна : старонкі гісторыі / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1989. – 20 чэрвеня.

400 год з дня прысваення Кобрыну магдэбургскага права.

**Мартынаў, А**. Музею 40 гадоў / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1988. – 9 мая.

**Мартынаў, А**. Першыя ахвяры вайны / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1988. – 14 красавіка.

Першыя гады акупацыі (1941-1942 гг.) на Кобрыншчыне.

**Мартынов, А.** Во славу русского оружия: к 175-летию Отечественной войны 1812 года / А. Мартынов // Заря. – 1987. – 6 августа.

**Мартынаў, А.** Войны ў гісторыі нашага горада / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1987. – 26 лютага, 7 сакавіка, 10 сакавіка.

**Мартынаў, А.** Дванаццаты памятны год : да 175-й гадавіны Айчыннай вайны 1812 года / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1987. – 30 ліпеня. – С. 2.

**Мартынаў, А.** Калі Кобрын дарыўся… : старонкі гісторыі / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1987. – 29 студзеня.

**Мартынаў, А.** Лёс архіваў нашага горада : старонкі гісторыі / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1987. – 6 студзеня. – С. 3.

**Мартынаў, А.** Межы мяняла гісторыя / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1987. – 7 лютага.

За сваю шматвекавую гісторыю тэрыторыя, якая называецца «Кобрыншчына», шмат разоў істотна мянялася.

**Мартынаў, А.** На **«**крэсах усходніх» / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1987. – 6 чэрвеня. – С. 2.

Кобрын у 1915-1927 гг.

**Мартынов, А**. На парозе новага часу / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1987. – 23 чэрвеня. – С. 2.

Кобрын у 1939 годзе.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**О присвоении звания** «Почётный гражданин города Кобрина» **Мартынову Алексею Михайловичу** : решение Кобринского городского исполнительного комитета, 16.09.1997 г., № 534 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 6. Д. 158. Л. 182.

**Аб узнагароджанні** А. М. Мартынава Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь : пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, 26 кастрычніка 1999 г., N 1661 // Рэспубліка. – 1999. – 2 лістапада.

**Долготович, Б. Д.** Мартынов Алексей Михайлович / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. - С. 31.

**Мартынаў Аляксей Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 437-438 : фат.

**Мартынов Алексей Михайлович** // Бібліяпанарама / УК «Абласная бібліятэка імя М. Горкага», аддзел бібліятэказнаўства. - Мінск, 2016. – С. 17, 18.

А. М. Мартынов - в списке ветеранов Великой Отечественной войны из числа сотрудников публичных библиотек Брестской области.

**Бакун, Е.** Чтобы помнили / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. — 2 кастрычніка. — С. 6 : фот.

В научно-практической конференции «Мартыновские чтения» приняли участие краеведы из разных регионов Беларуси.

**Вовк, Ю.** Объединяя усилия, изучаем историю Кобринщины / Юлия Вовк // Кобрин-информ. – 2019. – 26 сентября. – С. 3.

Состоялась научно-практическая конференция «Мартыновские чтения», посвященая 115-летию со дня рождения А. М. Мартынова и 80-летию воссоединения Западной Беларуссии с БССР.

**Курачук, С.** Асоба ў гісторыі малой радзімы ці Краязнаўца з вялікай літары / Святлана Курачук // Краязнаўчая газета. – 2019. – № 26 (763). – С. 3.

У Кобрынскай цэнтральнай раеннай бібліятэцы сабраны шэраг матэрыялаў-даследаванняў на папяровых і электронных носьбітах пра А. М. Мартынава.

**Курачук, С.** Краязнавец з вялікай літары / Святлана Курачук // Кобрынскі веснік. – 2019. – 21 жніўня. – С. 4.

У Кобрынскай цэнтральнай раеннай бібліятэцы сабраны на папяровых і электронных носьбітах шэраг матэрыялаў-даследаванняў пра А. М. Мартынава.

**Курачук, С.** Личность в истории малой родины / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2019. – 15 августа (№ 33). – С. 4. – (К 115-летию со дня рождения А. М. Мартынова. К 80-летию со дня основания Кобринский центральной районной библиотеки).

Кобринской центральной районной библиотекой подготовлен ряд материалов об А. М. Мартынове.

**Рысь, Е.** Сентябрь 1939-го в Кобрине: живые голоса истории / Е. Рысь // Кобрин-информ. – 2019. – 5 сентября (№ 36). – С. 4.

Воспоминания очевидца и участника событий А. М. Мартынова.

**Бурдыка, В.** Захавальнік гісторыі / Вячаслаў Бурдыка // Народная трыбуна. – 2016. – 11 лістапада. – С. 11.

Летапісцам Кобрыншчыны лічаць Аляксея Міхайлавіча Мартынава.

**Дубіна, Л.** Служыў ён музам сэрца ўвесь свой век / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. – 2014. – 30 жніўня. – С. 3.

Да 110-годдзя з дня нараджэння А .М. Мартынава.

**Казакова, А.** В ногу с XX веком / Анна Казакова // Кобрин-информ. – 2014. – 28 августа. – С. 7.

В одном из залов музея состоялся вечер памяти, посвящённый 110-летию со дня рождения А. Мартынова.

**Рысь, Е.** Он нам пример, как слышать мира пульс…/ Елена Рысь // Кобрин-информ. – 2014. – 21 августа. – С. 6, 7.

110-летию со дня рождения А. М. Мартынова посвящается.

**Рысь, Е.** Хранитель истории : к 100-летию со дня рождения А. М. Мартынова / Елена Рысь // Кобрынскі веснік. – 2004. – 18 жніўня. – С. 2 ; 21 жніўня.

**Бабенко, Е.** Историк, краевед, администратор / Елена Бабенко // Кобрынскі веснік. – 2009. – 22 жніўня. – С. 2.

**Бабенко, Е. В.** Муза Клио глазами летописца / Е. В. Бабенко // Кобрин-информ. – 2009. – 8 января.

**Сушко, Э.** Алексею Михайловичу Мартынову посвящается : стихотворение / Эмилия Сушко // Кобрынскі веснік. – 2009. – 22 жніўня. –С. 2.

**Бабенко, Е. В.** Суворовская «Наука побеждать», или Несколько слов о практическом применении этой весьма древней науки : к 278-й годовщине со дня рождения А. В. Суворова / Е. В. Бабенко // Кобрин-информ. – 2008. – 20 ноября.

Отрывок статьи посвящен А. М. Мартынову.

**Петровская, М.** Волей судьбы и людей : Военно-историческому музею имени А. В. Суворова – 60 / Мария Петровская ; фото Анатолия Шугая // Кобрынскі веснік. – 2006. - 23 верасня. – С. 3.

**Рысь, Е.** Лелея память края своего… / Елена Рысь // Кобрин-информ. – 2006. – 28 сентября. – С. 3.

У истоков Кобринского военно-исторического музея стоял А. М. Мартынов.

**Вержбицкая, В.** Личность в истории Кобрина / Виктория Вержбицкая // Кобрин-информ. – 2004. – 11 ноября. – С. 3.

**Рысь, А.** Захавальнік гісторыі : Аляксею Міхайлавічу Мартынаву - 100 гадоў з дня нараджэння / Алена Рысь // Краязнаўчая газета. – 2004. - № 36 (верасень).

**Рысь, Е.** Хранитель истории : к 100-летию со дня рождения А. М. Мартынова / Елена Рысь // Кобрынскі веснік. – 2004. – 18 жніўня. – С. 2 ; 21 жніўня. – С. 3.

**Макарук, О**. Жасмин с ароматом истории : хранитель вечности / Ольга Макарук // Заря. – 2003. – 19 июня.

**Аляксею Міхайлавічу Мартынаву** – 95 гадоў // Кобрынскі веснік. – 1999. – 21 жніўня.

**Алексей Михайлович Мартынов** : [некролог] // Кобрынскі веснік. – 1999. – 20 лістапада.

Сущук, А. Слово о старшем товарище : А. М. Мартынову – 90 лет / А. Сущук // Кобрынскі веснік. – 1994. – 24 жніўня.

***Бібліяграфічныя выданні***

**Краязнавец** з Вялікай літары : біябібліяграфічны паказальнік / УК «Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка», аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. - Кобрын, 2014. – 48 с.

**Мартынаў Аляксей Міхайлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 14-23.

**Краязнаўцу** і гісторыку прысвячаецца : каляндар урачыстасцей да 110-годдзя з дня нараджэння А. М. Мартынава / УК «Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка», аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2014. – 8 с.

**Краязнаўца**, даследчык з Вялікай літары. **А. М. Мартынаў** : з матэрыялаў да рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» / склад. : гал. бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі Святлана Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2015. – С. 5-10.

**Летапісец** Кобрынскага музея : зборнік артыкулаў А. М. Мартынава аб ваенна-гістарычным музеі / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. П. Сысоева. - Кобрын, 2014. – 80 с.

**Памяць** сэрца : тэма Вялікай Айчыннай вайны ў публікацыях А. М. Мартынава / УК «Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка», аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. П. Сысоева. - Кобрын, 2014. – 84 с.

**«Асоба** ў гісторыі Кобрына» : Аляксей Міхайлавіч Мартынаў // Каб не абарвалася нітка памяці… : нарыс аб краязнаўцах Кобрыншчыны / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук.– Кобрын, 2009. - С. 2-12.

**Живая** история города Кобрина : Алексей Михайлович Мартынов / Кобринская центральная районная библиотека. – Кобрин, 1998. – 5 с.

# МІЛАЯНІН
# ІВАН ФЁДАРАВІЧ

**МІЛАЯНІН Іван Фёдаравіч** (1912–1994) - Ганаровы грамадзянін горада Кобрына.



Нарадзіўся 17 красавіка 1912 года ў вёсцы Васільеўка Палтаўскай вобласці (Украіна).

У 1934 годзе прызваны ў Чырвоную армію. Пасля заканчэння школы малодшых камандзіраў прызначаны памочнікам камандзіра ўзвода школы, прымаў удзел у вызваленчым паходзе Чырвонай арміі ў Заходнюю Украіну ў 1939 годзе.

У Вялікую Айчынную вайну на фронце з ліпеня 1941 года. Пачынаў вайну ў званні малодшага лейтэнанта, скончыў маёрам. І. Ф. Мілаянін ваяваў на Сталінградскім фронце, удзельнічаў у вызваленні Данбаса, Нікалаева, Нікапаля, Баранавічаў, Брэста, Кобрына. Прымаў удзел у разгроме варожай групоўкі ва Усходняй Прусіі, узяцці г. Кенігсберга. Удзельнік штурму Берліна.

Да 1946 года працягваў службу ў Чырвонай Арміі. З 1946 па 1955 год працаваў у апараце Брэсцкага абкама партыі. У 1952 годзе закончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС.

У чэрвені 1955 года І. Ф. Мілаянін выбраны старшынёй калгаса «Перамога» Кобрынскага раёна. Сельскай гаспадарцы аддаў восем гадоў напружанай працы - гэта быў час станаўлення калектыўнай формы гаспадарання. З 1963 года ўзначаліў Кобрынскую міжкалгасную будаўнічую арганізацыю.

З 1972 года Іван Федаравіч - персанальны пенсіянер рэспубліканскага значэння. Гэты энергічны чалавек і на пенсіі не мог сядзець без спраў: яшчэ шмат гадоў працаваў памочнікам начальніка аддзела рабочага забеспячэння «Галоўпалессевадбуд» па кадрах.

Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі «За ўзяцце Кенігсберга», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.», «За трудовое отличие», «За доблестный труд».

Рашэннем Кобрынскага гарадскога Савета народных дэпутатаў № 237 ад 15 верасня 1987 года Мілаяніну Івану Фёдаравічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына».

Памёр Іван Федаравіч Мілаянін 1 чэрвеня 1994 года.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**О присвоении** звания Почетных граждан города Кобрина **Милоянину Ивану Фёдаравичу** : решение Кобринского городского Совета народных депутатов, 15.09.1987 г., № 237 // Кобринский зональный государственный архив. - Ф. 186. Оп. 4. Д. 149. Л. 14.

**О награждении** Почетной грамотой и Грамотой Верховного Совета Белорусской ССР ветеранов гражданской и Великой Отечественной войн, активных участников социалистического строительства. **Милоянина Ивана Федоровича** : Указ Президиума Верховного Совета БССР // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп.1. Д. 675. Л. 102.

**О награждении** медалью «Ветеран труда» **Милоянина Ивана Федоровича** : решение исполнительного комитета Брестского областного Совета народных депутатов, 26.10.1977 г., № 691 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д.617. Лл. 49, 50.

**Долготович, Б. Д.** Милоянин Иван Федорович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 31.

**Мілаянін Іван Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 244. - (Крутымі дарогамі вайны).

**Мілаянін Іван Фёдаравіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп’ютарны дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 23-24.

**Курашова, Л.** Двести огненных дней / Лидия Курашова // Кобрин-информ. - 2018. — 1 февраля. - С. 4.

**Іван Фёдаравіч Мілаянін** // Кобрынскі веснік. – 2002. – 20 ліпеня. – (Кобрына Ганаровыя грамадзяне).

# ПАДБЯРЭЗІН ІЛЬЯ МІХАЙЛАВІЧ

**ПАДБЯРЭЗІН Ілья Міхайлавіч** (1902–1990) - Ганаровы грамадзянін горада Кобрына.



Нарадзіўся ў горадзе Навазыбкаў Чарнігаўскай губерні (Расія). Закончыў ваенныя акадэміі імя Фрунзе і Генеральнага штаба.

Удзельнік Грамадзянскай вайны. Быў ад'ютантам камандзіра палка, затым закончыў кароткатэрміновыя курсы камандзіраў у Кіеве і служыў да канца Грамадзянскай вайны.

У гады Вялікай Айчыннай ваяваў на розных франтах. У ліпені 1944 года ў складзе 692 стралковага палка ўдзельнічаў у вызваленні Кобрына (полк атрымаў ганаровае найменне Кобрынскага).

За ўмелае кіраўніцтва ў баі і праяўленую ініцыятыву і мужнасць за вызваленне г. Рыгі ўзнагароджаны ордэнам Аляксандра Неўскага.

З 1963 года Ілья Міхайлавіч у адстаўцы.

Узнагароды: ордэн Леніна, тры ордэны Чырвонага Сцяга, ордэн Чырвонай Зоркі, ордэн Аляксандра Неўскага, ордэн Кутузава і больш за дзесяць медалёў.

Звання «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына» Падбярэзін Ілья Міхайлавіч удастоены ў 1974 годзе (рашэнне выканкама Кобрынскага гарадскога Савета дэпутатаў № 104 ад 14.06.1974 г.).

**Подберезин, Б.** Память / Борис Подберезин. – Рига : Radars, 2015.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**О присвоении** звания «Почетный граждан города Кобрина» **Подберезину Ивану Фёдоровичу** : решение исполнительного комитета Кобринского городского Совета депутатов трудящихся, 14 июня 1974 г., № 104 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 432. Л. 20.

**Долготович, Б. Д.** Подберезин Илья Михайлович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 32.

**Падбярэзін Ілья Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 237. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

**Падбярэзін Ілья Міхайлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук. – Кобрын, 2018. – С. 24-25.

**Ілья Міхайлавіч Падбярэзін** // Кобрынскі веснік. – 2002. – 20 ліпеня. - (Кобрына Ганаровыя грамадзяне).

**Подберезин Илья Михайлович** // Список почетных граждан города Кобрина / отдел идеологической работы Кобринского райисполкома. – Кобрин, 2002. – С. 2.

# САНДАЛАЎ ЛЕАНІД МІХАЙЛАВІЧ

**САНДАЛАЎ *Леанід Міхайлавіч*** (1900-1987) - Ганаровы грамадзянін горада Кобрына.



Нарадзіўся 28 сакавіка (10 красавіка) 1900 года ў горадзе Вічуга Іванаўскай вобласці (Расія). У восем гадоў бацькі аддалі яго ў Тэзінскае пяцікласнае фабрычнае вучылішча, якое Леанід закончыў з пахвальнай граматай.

Да 1919 года працаваў на фабрыцы. Быў адным з арганізатараў і кіраўнікоў мясцовай камсамольскай арганізацыі. У 1919 годзе добраахвотна паступіў на Іванава-Узнясенскія курсы камсаставу, затым ваяваў на франтах Грамадзянскай вайны. У Чырвонай арміі з 1919 года. Член КПСС з 1925 года.

У 1926 годзе Леанід Сандалаў закончыў Кіеўскую аб'яднаную ваенную школу камандзіраў, у 1934-м - Ваенную акадэмію імя М. В. Фрунзе, у 1937-м - Ваенную акадэмію Генштаба.

Ён удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 годзе. З 1940 года Л. М. Сандалаў начальнік штаба, у ліпені-жніўні 1941 года - камандуючы 4-й арміяй, начальнік штаба Цэнтральнага фронту. Удзельнік баёў на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у абарончых баях у раёне Брэста, Жабінкі, Кобрына і інш. У 1941-1945 гадах - начальнік штаба Бранскага, 2-га Прыбалтыйскага, 4-га Украінскага франтоў. Генерал-палкоўнік (1944).

Да 1953 года - на камандных пасадах у Савецкай арміі. З 1953 па 1955 год знаходзіўся ў распараджэнні Міністра абароны СССР. З верасня 1955 года ў запасе.

Л. М. Сандалаў - аўтар шэрагу мемуараў пра Вялікую Айчынную вайну: «Пагарэла-Гарадзішчанская аперацыя» (1960), «Цяжкія рубяжы» (1965), «Перажытае» (1966), «На маскоўскім напрамку» (1970), «Пасля пералому» (1983).

Леанід Міхайлавіч узнагароджаны 3 ордэнамі Леніна, 4 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Суворава і Кутузава I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі, а таксама замежнымі ордэнамі.

У 1966 годзе Л. М. Сандалаў стаў Ганаровым грамадзянінам горада Кобрына (рашэнне выканкама Кобрынскага гарадскога Савета дэпутатаў № 261 ад 30.08.1966 г.). Леанід Міхайлавіч таксама з'яўляецца Ганаровым грамадзянінам горада Вічугі (Расія), горада Рыгі (Латвія).

Памёр Леанід Міхайлавіч 23 кастрычніка 1987 года, пахаваны ў Маскве на Кунцаўскіх могілках.

Леанід Міхайлавіч Сандалаў па праве належыць да выдатнай плеяды палкаводцаў Вялікай Айчыннай вайны. Кіруючы армейскімі, а пазней і франтавымі штабамі, ён прайшоў нялёгкімі дарогамі вайны з першага да апошняга яе дня.

### *Працы*

**Сандалов, Л. М.** В первые часы войны / Л. М. Сандалов // 1418 дней войны : из воспоминаний о Великой Отечественной / сост. Е. Н. Цветаев, В. С. Яровиков. – М., 1990. – С. 52-60.

**Сандалов, Л. М**. Пережитое / Л. М. Сандалов. - М. : Воениздат, 1961. - 192 с. - (Военные мемуары).

**Дайнес, В. О.** Командармы 1941 года. Доблесть и трагедия / В. О. Дайнес. – М. : «Вече», 2017. – 432 с. – (Вся правда о войне).

Воспоминания Л. М. Сандалова, Кобрин – см. на с. 208, 210, 214, 217, 219.

**Так начиналась** война : из воспоминаний генерал-полковника Л. М. Сандалова // Память : историко-документальная хроника Березовского района. – Минск, 1987. – С. 122, 123-127, 128. – (Шла война священная…).

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**О присвоении** звания «Почетного гражданина города Кобрина» **Сандалову Леониду Михайловичу** : решение исполнительного комитета Кобринского городского Совета депутатов трудящихся, 30 августа 1966 г., № 261 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 138. Л. 177.

**Дайнес, В. О.** Командармы 1941 года. Доблесть и трагедия / В. О. Дайнес. – М. : «Вече», 2017. – 432 с. – (Вся правда о войне).

См. на с. 208, 210, 214, 217, 219.

**Долготович, Б. Д.** Сандалов Леонид Михайлович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 32.

**Иоффе, Э. Г.** Советские военачальники на белорусской земле : путеводитель по местам жизни и деятельности / Эмануил Григорьевич Иоффе. – Минск : Полымя, 1988. – 239 с.

См. на с. 223.

**Сандалов Леонид Михайлович** // Большая советская энциклопедия : [в 30 т.]. – М., 1975. – Т. 22. - С. 557.

**Сандалов Леонид Михайлович** // 1418 дней войны : из воспоминаний о Великой Отечественной / сост. Е. Н. Цветаев, В. С. Яровиков. – М., 1990. – С. 612.

**Сандалаў Леанід Міхайлавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 14. - С. 147.

**Сандалаў Леанід Міхайлавіч** // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941-1945 : энцыклапедыя. – Мінск, 1990. – С. 554-555.

**Сандалаў Леанід Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 139. - (Так пачыналася).

**Сандалаў Леанід Міхайлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 25-27.

**Смирнов, Н. И.** Партизанский «Второй фронт» в Беларуси : имена, факты, операции НКВД (НКГБ) в тылу врага / Николай Смирнов. - Минск : Звязда, 2020. – 421 с.

См. на с. 216-217.

**Штеменко С. М.** Генеральный штаб в годы войны / Сергей Матвеевич Штеменко. – М. : Воениздат, 1968. - 415 с. – (Военные мемуары).

См. на с. 275-276.

**Сарычев, В.** Блокнотик Ходцевой : авторский проект «В поисках утраченного времени» / Василий Сарычев // Вечерний Брест. - 2019. - 5 июля (№ 27). - С. 6.

Воспоминания о генерале Л. М. Сандалове.

**Фридлендер, Н.** Момент истины : К 115-летию со дня рождения Леонида Михайловича Сандалова / Наталья Фридлендер // Кобрин-информ. – 2015. - 9 апреля. – С. 11.

Участником оборонительных сражений первых дней войны на Кобринщине был Л. М. Сандалов, ставший в 1966 г. почетным гражданином.

**Рысь, Е**. Воздушные труженики войны / Елена Рысь // Кобрынскі веснік. – 2009. – 10 чэрвеня, 17 чэрвеня.

Начальный этап войны освещают многочисленные издания книжного фонда музея, среди них с дарственной надписью автора - генерал-полковника Л. М. Сандалова.

**Курашова, Л. И.** Защищая небо Отчизны / Л. И. Курашова // Кобрин-информ. – 2006. – 22 июня. – С. 14.

Воспоминания Л. М. Сандалова о начале Великой Отечественной войны.

# СІДАРУК
# ПРАСКОЎЯ СЯМЁНАЎНА

**СІДАРУК Праскоўя Сямёнаўна** (1909–2001) - Ганаровы грамадзянін горада Кобрына.



Яе біяграфія - жыццёвая і працоўная - у многім тыпічная для заходніх беларусаў старэйшага пакалення, якія зведалі на сабе акупацыйны рэжым і панскі прыгнёт, з маладых гадоў уключаліся ў вызваленчую палітычную барацьбу.

П. С. Сідарук нарадзілася ў вёсцыІлаўск Кобрынскага павета (цяпер Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці) . Да 1928 года працавала ў гаспадарцы бацькоў, а наступныя чатыры гады была работніцай у швейнай майстэрні ў г. Кобрыне. Тут у 1931 годзе яна ўступіла ў кампартыю Заходняй Беларусі. У 1932 годзе за палітычную дзейнасць і прыналежнасць да КПЗБ была асуджана да двух гадоў турэмнага зняволення, а пасля кароткага знаходжання на волі, у 1935 годзе, зноў стала палітвязнем у польскай турме, дзе знаходзілася да 1939 года.

Пасля вызвалення Заходняй Беларусі Чырвонай Арміяй у верасні 1939 года П. С. Сідарук актыўна ўкпючылася ў наладжванне новага жыцця. Кароткі час яна загадвае дзіцячым садам у г. Кобрыне, у 1940 годзе пераязджае ў Саратаўскую вобласць Расіі, дзе да 1943 года працуе старшынёй сельскага Савета ў мястэчку Гарадзец, падлікоўцам у калгасе «20 гадоў Кастрычніка».

У 1943 годзе П. С. Сідарук становіцца курсантам спецшколы ў г. Маскве, а пасля заканчэння гэтай школы ў студзені 1944 года была перакінута на акупіраваную фашыстамі тэрыторыю інструктарам Антопальскага падпольнага райкама КПБ у партызанскім атрадзе імя Кірава.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкай акупацыі ў 1944 годзе Праскоўя Сямёнаўна кароткі час працуе трэцім сакратарам Антопальскага РК КПБ. З канца 1944 па 1946 год з'яўлялася слухачом партшколы пры ЦК КПБ у г. Мінску.

Пасля заканчэння партшколы і да 1948 года П. С. Сідарук загадвае аддзелам па рабоце сярод жанчын Кобрынскага РК КПБ, з 1948 па 1953 год яна - трэці сакратар гэтага райкама. У 1953 годзе Праскоўя Сямёнаўна пераходзіць на савецкую работу і на працягу шасці гадоў працуе намеснікам старшыні Кобрынскага райвыканкама.

У 1959 годзе П. С. Сідарук выйшла на пенсію. Але яшчэ шмат гадоў яна прымала актыўны ўдзел у грамадскім жыцці горада і раёна.

За баявыя заслугі ў Вялікай Айчыннай вайне, працоўную дзейнасць П. С. Сідарук узнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Партызану Айчыннай вайны» І ступені, юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР ІІ склікання. Сідарук П. С. - персанальная пенсіянерка рэспубліканскага значэння.

Высокую ацэнку працы П. С. Сідарук далі і кабрынчане, удастоіўшы яе ў 1964 годзе звання «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына» (рашэнне Кобрынскага гарадскога выканкама за № 203 ад 18.07.1964 г.).

Памерла Праскоўя Сямёнаўна Сідарук 2 чэрвеня 2001 года на 92-м годзе жыцця .

## *Аб жыцці і дзейнасці*

**О награждении** Почетной грамотой и Грамотой Верховного Совета Белорусской ССР ветеранов гражданской и Великой Отечественной войн, активных участников социалистического строительства. **Сидорук Прасковью Семеновну** : Указ Президиума Верховного Совета Белорусской ССР // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 675. Л. 102.

**О награждении** юбилейной медалью «За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина». **Сидорук Прасковью Семеновну** : постановление Брестского обкома КПБ, исполкома Брестского областного Совета депутатов трудящихся, президиума областного Совета профсоюзов, 27 марта 1970 г., № 58-а // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 4. Оп. 1. Д. 594. Лл. 1, 8, 9, 54, 55, 78, 80, 88.

**Долготович, Б. Д.** Сидорук Прасковья Семеновна / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 32-33.

**Сідарук Праскоўя Сямёнаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 455. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Сідарук Праскоўя Сямёнаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 292. - (Яны прайшлі дарогамі вайны).

**Сідарук Праскоўя Сямёнаўна** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі : інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 27-28.

**110 гадоў** з дня нараджэння П. С. Сідарук // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 107-108.

**Белов, Д.** Сквозь аресты и тюрьмы ... / Д. Белов // Кобрынскі веснік. – 2009. - 11 сакавіка. - С. 3.

Участником событий воссоединения Западной Белоруссии с БССР была П. Сидорук.

**Праскоўя Сямёнаўна Сідарук** // Кобрынскі веснік. – 2002. – 20 ліпеня. – (Кобрына Ганаровыя грамадзяне).

**Сідарук Праскоўя Сямёнаўна** : [некралог] // Кобрынскі веснік. – 2001. – чэрвень. – С. 4.

**Сідарук, П. С.** Мы падымаем сцяг … «Правда» несла нам праўду / П. С. Сідарук, І. С. Сідарук // Камуністычная праца. – 1980. - 6 снежня. – С. 2.

Успаміны ўдзельніцы рэвалюцыйнага падполля, Ганаровай грамадзянкі горада Кобрына, персанальнай пенсіянеркі П. С. Сідарук.

# СЯЛЮК
# ПЁТР ДЗЯНІСАВІЧ

**СЯЛЮК Пётр Дзянісавіч** (1939–2010) - Ганаровы грамадзянін горада Кобрына.



Нарадзіўся 12 ліпеня 1939 года ў вёсцы Філіповічы Капаткевіцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. На яго долю выпаў лёс мільёнаў дзяцей вайны. Каб выратаваць свайго адзінага сына, маці Пятра Дзянісавіча перабралася з разбуранай фашыстамі Гомельшчыны на захад Беларусі. Так Пётр Сялюк стаў кабрынчанінам.

У 1957 годзе пасля заканчэння 8 класаў сярэдняй школы № 2 г. Кобрына П. Сялюк пачаў сваю працоўную біяграфію аўтаслесарам пры вайсковай часці ў п. Мачулішчы Мінскага раёна. Пасля працы вучыўся ў Мінскім аэраклубе на курсах пілота, якія закончыў у 1959 годзе.

У студзені 1958 года П. Сялюк пераехаў у горад Кобрын, які стаў яму другой радзімай. Токар, слесар, фрэзероўшчык, расточнік... Такімі прафесіямі авалодаў Пётр Сялюк у Кобрыне. У 1961 годзе ён закончыў школу працоўнай моладзі.

З верасня 1959 года і да апошняга дня Пётр Дзянісавіч працаваў на Кобрынскім рамонтным заводзе. Пачынаў з падсобнага рабочага, быў слесарам, токарам, наладчыкам. Старанне рабочага адзначалася рознымі званнямі, граматамі. За высокія паказчыкі ў працы Пётр Дзянісавіч Сялюк узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», Працоўнай Славы II і III ступеняў, медалём «За доблесную працу» (1970), «Ветэран працы»(1984).

Пётр Дзянісавіч актыўна ўдзельнічаў у жыцці завода, быў членам бюро гарадскога камітэта КПБ і партбюро завода, дэлегатам XXVIII з'езда КПБ і XXVI з'езда КПСС. У 1971 годзе яму было прысвоена званне «Ударнік камуністычнай працы».

Неаднаразова П. Д. Сялюк быў пераможцам сацыялістычных спаборніцтваў, прызнаны лепшым па прафесіі, унёс мноства рацыяналізатарскіх прапаноў.

На заводзе ён з'яўляўся старшынёй савета настаўнікаў моладзі. Узнагароджаны нагрудным знакам «Настаўнік моладзі» (1976). 31 мая 1978 года Пятру Дзянісавічу прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік працоўнай моладзі Беларускай ССР».

П. Д. Сялюк - удзельнік выстаў ВДНГ СССР (1971) і ВДНГ БССР (1979).

Узнагароджваўся Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, быў занесены на Дошку гонару і ў Кнігу гонару завода.

У год святкавання 700-годдзя г. Кобрына Селюку Пятру Дзянісавічу было прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына» (рашэнне Кобрынскага гарсавета № 237 ад 15.09.1987 г.).

Памёр Пётр Дзянісавіч Сялюк 28 снежня 2010 года.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**О присвоении** звания Почетных граждан города Кобрина **Селюку Петра Денисовича** : решение Кобринского городского Совета народных депутатов, 15.09.1987 г., № 237 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 4. Д. 149. Л. 14.

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно- технических работников и служащих предприятий и организаций Всесоюзного объединения «Союзсельхозтехника» Совета Министров СССР. **Селюка Петра Денисовича** // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 617. Л. 29.

**О представлении** к награждению Почетной Грамотой Совета Министров Республики Беларусь **Селюка Петра Денисовича** : решение Кобринского районного исполнительного комитета, 27.04.1999 г., № 257 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 6. Д. 331. Л.11.

**Представление** к награждению Почётной грамотой Совета Министров Республики Беларусь **Селюка Петра Денисовича** : приложение к Положению о Почётной грамоте Совета Министров Республики Беларусь, утверждённому постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12 февраля 1997 г. № 80 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 6. Д. 331. Л. 14 об.

**Долготович, Б. Д.** Селюк Петр Денисович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 32.

**Заслужаныя** настаўнікі працуючай моладзі Беларускай ССР. 1978. П. Д. Сялюк // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1998. - Т. 6. - С. 555.

**Сялюк Пётр Дзянісавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 76 : фат.

**Сялюк Пётр Дзянісавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі : інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 29-30.

**Селюк Петр Денисович** : некролог / районный исполнительный комитет, районный Совет депутатов // Кобрынскі веснік. – 2011. – 5 студзеня. – С. 3.

**Мельнік, Р.** Жыццевае крэда Пятра Селюка / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2006. – 22 ліпеня.

**Пётр Дзянісавіч Сялюк** // Кобрынскі веснік. – 2002. – 20 ліпеня. – (Кобрына Ганаровыя грамадзяне).

**Лясняк, П.** Побач - настаўнік / П. Лясняк // Камуністычная праца. – 1981. – 6 кастрычніка.

**Петр Денисович Селюк**, токарь Кобринского авторемонтного завода // Камуністычная праца. – 1981. – 3 лютага.

**Праводзілі** делегата на з'езд // Камуністычная праца. – 1981. – 21 лютага.

Урачыста праводзілі на XXVI з'езд КПСС токара рамонтнага завода Пятра Дзянісавіча Селюка яго таварышы па працы.

**Селюк, П. Д.** Давать бой равнодушию / Петр Денисович Селюк // Заря. - 1981. – 11 июля. – С. 2.

Токарь Кобринского авторемонтного завода, член бюро горкома КПБ П. Д. Селюк.

**Романов, В.** Простые истины / В. Романов // Заря. – 1981. - 17 января.

Вся рабочая биография Петра Денисовича Селюка связана с Кобринским авторемзаводом.

[**Вярнуўшыся** з XXVI з’езда КПСС] // Камуністычная праца. – 1981. – 7 сакавіка.

Вярнуўшыся з XXVI з’езда КПСС, яго дэлегат, токар рамонтнага завода Пётр Дзянісавіч Сялюк, падзяліўся з таварышамі сваімі ўражаннямі.

**Селюк Петр Денисович** // Список почетных граждан города Кобрина / отдел идеологической работы Кобринского исполкома. – Кобрин, 2002. – С. 1.

**Протокол** вручения юбилейной медали «За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина» **Селюку Петру Денисовичу** // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 342. Лл. 10, 12.

**Список** Кобринского ремонтного завода Брестской области Белорусской ССР на лиц, представляемых к награждению юбилейной медалью «За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина». **Селюка Петра Денисовича** // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 254. Лл. 28, 40, 44.

# ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ КОБРЫНСКАГА РАЁНА

**ГОЛЬЦМАН АНДРЭЙ МІХАЙЛАВІЧ**

**КАРАНЧУК ПАВЕЛ РЫГОРАВІЧ**

**КЕНДА МІКАЛАЙ АЛЯКСЕЕВІЧ**

**КЛАЧКОВІЧ МАРЫЯ МІКАЛАЕЎНА**

**КУЗІЧ УЛАДЗІМІР РЫГОРАВІЧ**

**МАРОЗ ІВАН ПАЎЛАВІЧ**

**ПАПРОЦКІ ПЁТР СЯРГЕЕВІЧ**

**СУХАРАЎ УЛАДЗІМІР ІВАНАВІЧ**

**ЧЫРУН СВЯТЛАНА ІОСІФАЎНА**

КОБРЫНСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

КОБРИНСКИЙ РАЙОННЫЙ СОВЕТ ДЕПУТАТОВ

**Р Е Ш Е Н И Е**

28 ноября 2014 г. № 29

г. Кобрин

**О звании «Почётный гражданин Кобринского района»**

На основании пункта 1 статьи 13 и подпункта 1.3 пункта 1 статьи 19 Закона Республики Беларусь от 4 января 2010 года «О местном управлении и самоуправлении в Республике Беларусь» Кобринский районный Совет депутатов РЕШИЛ:

1. Учредить в Кобринском районе звание «Почётный гражданин Кобринского района».

2. Утвердить прилагаемую Инструкцию о порядке присвоения звания «Почётный гражданин Кобринского района».

3. Настоящее решение вступает в силу после его официального опубликования.

Председатель
Кобринского
районного
Совета депутатов И. А. Довжук

УТВЕРЖДЕНО

Решение
Кобринского районного
Совета депутатов
28.11.2014 № 29

# ИНСТРУКЦИЯ
# о порядке присвоения звания «Почётный гражданин Кобринского района»

1. Инструкция о порядке присвоения звания «Почётный гражданин Кобринского района» регулирует основания и порядок присвоения звания «Почётный гражданин Кобринского района».

2. Звание «Почётный гражданин Кобринского района» является высшей степенью признательности жителей Кобринского района и присваивается при жизни гражданам Республики Беларусь, проживающим на территории Кобринского района, а также жителям иных регионов и гражданам иностранных государств.

3. Основаниями для присвоения звания «Почётный гражданин Кобринского района» являются:

выдающийся личный вклад в производственную, общественно-культурную деятельность, развитие экономики, науки, культуры, искусства, образования, здравоохранения, физической культуры и спорта;

особые заслуги, проявленные в чрезвычайных ситуациях при исполнении служебного и гражданского долга;

иные заслуги и достижения, получившие широкое общественное признание в Республике Беларусь и за рубежом.

4. Звание «Почётный гражданин Кобринского района» присваивается решением Кобринского районного Совета депутатов (далее - Совет депутатов) по представлению Кобринского районного исполнительного комитета (далее - райисполком).

5. Ходатайства о присвоении звания «Почётный гражданин Кобринского района» представляются в райисполком:

5.1. постоянными комиссиями Совета депутатов;

5.2. заместителями председателя райисполкома;

5.3. структурными подразделениями райисполкома;

5.4. сельскими исполнительными комитетами;

5.5. трудовыми коллективами организаций;

5.6. коллегиальными органами управления политических партий, общественных и религиозных объединений.

6. Ходатайство о присвоении звания «Почётный гражданин Кобринского района» должно содержать описание конкретных достижений и заслуг. Вместе с ходатайством представляются справка-объективка на кандидата, характеристика, содержащая биографические сведения и сведения о трудовой, общественной и иной деятельности.

После принятия райисполкомом решения о представлении кандидатуры на присвоение звания «Почётный гражданин Кобринского района» все материалы с решением райисполкома направляются в Совет депутатов для их рассмотрения.

Кандидат на присвоение звания «Почётный гражданин» считается удостоенным данного звания после принятия соответствующего решения Советом депутатов.

7. Лицу, удостоенному звания «Почётный гражданин Кобринского района», в торжественной обстановке вручаются подписанные председателями Совета депутатов и райисполкома, свидетельство и удостоверение о присвоении звания «Почётный гражданин Кобринского района», а также памятная лента, единовременное денежное вознаграждение в размере тридцати базовых величин и цветы на сумму до двух базовых величин.

Образцы свидетельства, памятной ленты и удостоверения почетного гражданина Кобринского района утверждаются решением президиума Совета депутатов.

Сведения о лицах, удостоенных звания «Почётный гражданин Кобринского района», заносятся в книгу почетных граждан Кобринского района, ведение и хранение которой осуществляет учреждение культуры «Кобринский военно-исторический музей имени А. В. Суворова».

9. Решение Совета депутатов о присвоении звания «Почётный гражданин Кобринского района» публикуется в районной газете «Кобрынскі веснік».

10. Лица, удостоенные звания «Почётный гражданин Кобринского района»:

приглашаются для участия в торжественных мероприятиях, проводимых в Кобринском районе;

вправе быть принятыми безотлагательно председателем Совета депутатов, председателем райисполкома, должностными лицами органов государственной власти, руководителями организаций всех форм собственности.

11. В целях увековечения памяти почетных граждан по согласованию с родственниками их именами могут быть названы улицы, площади, парки и скверы населенных пунктов Кобринского района.

12. Лицо, удостоенное звания «Почётный гражданин Кобринского района», может быть лишено этого звания в связи со вступившим в законную силу в отношении него обвинительного приговора суда.

Ходатайство о лишении звания «Почётный гражданин Кобринского района» вносится на рассмотрение Совета депутатов райисполкомом или по требованию одной трети депутатов от числа избранных депутатов Совета депутатов.

Решение о лишении звания «Почётный гражданин Кобринского района» принимается Советом депутатов.

13. Финансирование расходов, связанных с присвоением звания «Почётный гражданин Кобринского района», производится за счет средств районного бюджета.

КОБРЫНСКІ РАЁННЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

КОБРИНСКИЙ РАЙОННЫЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**Р Е Ш Е Н И Е**

№ 771

10.08.2005

г. Кобрин

# Об утверждении Положения О порядке присвоения звания «Почётный гражданин Кобринского района»

Руководствуясь Законом Республики Беларусь «Об утверждении Указа Президиума Верховного Совета Республики Беларусь «Об утверждении Положения о порядке учреждения и присвоения в Республике Беларусь звания почётного гражданина города, района» (свод законов БССР, 1985 г., № 10, стр. 148), районный исполнительный комитет РЕШИЛ:

1. Утвердить Положение о порядке присвоения звания «Почётный гражданин Кобринского района» (прилагается).
2. Утвердить образец свидетельства «Почётный гражданин Кобринского района» (прилагается).
3. Ходатайствовать перед районным Советом депутатов об утверждении Положения о порядке присвоения звания «Почётный гражданин Кобринского района».

Председатель К.В.Синевич

Управляющий делами Н. А. Луценко

*Даведка*

# Званне
# «Ганаровы грамадзянін
# КОБРЫНСКАГА РАЁНА»

**з'яўляецца вышэйшай ступенню ўдзячнасці жыхароў Кобрынскага раёна і прысвойваецца пры жыцці грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія пражываюць на тэрыторыі Кобрынскага раёна, а таксама жыхарам іншых рэгіёнаў і грамадзянам замежных дзяржаў.**

**Падставамі для прысваення звання «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна» з'яўляюцца выдатны асабісты ўклад у вытворчую, грамадска-культурную дзейнасць, развіццё эканомікі, навукі, культуры, мастацтва, адукацыі, аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту, асаблівыя заслугі, праяўленыя ў надзвычайных сітуацыях пры выкананні службовага і грамадзянскага абавязку, а таксама іншыя заслугі і дасягненні, якія атрымалі шырокае грамадскае прызнанне ў Рэспубліцы Беларусь і за мяжой.**

# ГОЛЬЦМАН
# АНДРЭЙ МІХАЙЛАВІЧ

**ГОЛЬЦМАН Андрэй Міхайлавіч** нарадзіўся 12 лістапада 1970 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. Закончыў Кобрынскую сярэднюю школу № 5.



Сваю працоўную дзейнасць Андрэй Гольцман пачаў ў 1988 годзе муляром перасовачнай механізаванай калоны № 44 г. Кобрына. Служыў у радах Узброеных Сіл.

Пасля заканчэння Брэсцкага політэхнічнага інстытута з 1994 па 1996 год працаваў начальнікам аддзела збыту ТАА «Амега» г. Кобрына, з 1997 па 1998 год - на пасадзе інжынера аддзела камплектацыі Кобрынскага прадпрыемства «Полесьеводстройкомплект».

У 1998 годзе Гольцман А. М. стварыў сумеснае прадпрыемства па вытворчасці цацак з пластмасы. На сённяшні дзень Андрэй Міхайлавіч з'яўляецца адным з уласнікаў магутнага вытворчага прадпрыемства з абмежаванай адказнасцю «ВП Палессе». Пад яго кіраўніцтвам прадпрыемства дасягнула высокіх эканамічных і вытворчых паказчыкаў. СТАА «ВП Палессе» - гэта адзін з найбуйнейшых вытворцаў пластмасавых цацак у Еўропе і СНД. Сёння асартымент, які выпускаецца прадпрыемствам, налічвае больш за 4 000 найменняў у розных таварных групах. СТАА «ВП Палессе» ажыццяўляе аптовыя пастаўкі ў краіны СНД, Еўропы, Азіяцкага рэгіёну, Амерыкі, Афрыкі і Аўстраліі. Да гэтай прадукцыі праяўляюць цікавасць рынкі больш чым 70 краін свету.

За час працоўнай дзейнасці прафесіяналізм А. М. Гольцмана адзначаўся на самым высокім узроўні. У 2014 годзе яму аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Працоўны калектыў СТАА «ВП Палессе» неаднаразова ўзнагароджваўся дыпломамі Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта за ўдзел у раённых аглядах-конкурсах. Па выніках 2010 года «Палессе» на раённым і абласным узроўнях удастоена ганаровага звання «Лепшы прадпрымальнік-мецэнат». У 2010 годзе А. М. Гольцман прымаў удзел у IV Усебеларускім народным сходзе.

Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 155 ад 20 чэрвеня 2017 года за асабісты ўклад у развіццё эканомікі раёна і грамадскую дзейнасць Гольцману Андрэю Міхайлавічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**О представлении** кандидатур на присвоение звания «Почетный гражданин Кобринского района». **Гольцмана Андрея Михайловича** : решение Кобринского районного исполнительного комитета, 9 июня 2017 г., № 744. – Кобрин, 2017.

**О присвоении** звания «Почетный гражданин Кобринского района» **Гольцману Андрею Михайловичу** : решение Кобринского районного Совета депутатов, 28 ноября 2014 г., № 29 // Кобрынскі веснік. – 2017. – 28 чэрвеня. – С. 1.

**Гольцман Андрэй Міхайлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі: інжынер-праграміст П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 37-38.

**Гольцман, А.** Горад, дзе збываюцца мары / Андрэй Гольцман // Кобрынскі веснік. – 2019. – 20 ліпеня. – С. 3.

**Гольцман, А. М.** Дарить радость детям / [Андрей Гольцман ; беседовала] Елена Бакун // Государственный контроль. - 2017. - № 2. - С. 80-82.

**Гольцман, А. М**. Страна игрушек: столица - Кобрин / [Андрей Гольцман ; беседовала] Оксана Кузнецова // Экономическая газета. - 2017. - 17 февраля. - С. 1, 3.

Беседа с директором СООО «ПП Полесье» А. М. Гольцманом об истории успеха кобринского предприятия.

**Они славят** Кобринщину трудом // Кобрин-информ. - 2017. - 20 июля. - С. 2.

Звание «Почетный гражданин Кобринского района» присвоено А. Гольцману и С. Чирун.

**Гольцман, А.** «У мірны час здзяйсняюцца ўсе мары!» / Андрэй Гольцман, Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2015. - 18 ліпеня. - С. 4.

А. Гольцман, дырэктар СТАА «ВП Палессе», - аб гісторыі прадпрыемства, яго сённяшнім дні і перспектывах.

**ТОП-50** бизнесменов Брестской области // Кобрин-информ. - 2015. - 8 января. - С. 3.

В число успешных вошли бизнесмены из Кобрина: на 16 строчке – А. Гольцман.

**Рубашевский, Ю**. «Вся республика пытается угнаться за Брестчиной» / Юрий Рубашевский // Вечерний Брест. - 2014.— 23 апреля.— С. 5.

Директор СООО «ПП Полесье» А. М. Гольцман стал лауреатом правительства Республики Беларусь.

**Андрей Гольцман** - «Человек года» за 2011 год // Кобрынскі веснік. - 2012. - 25 красавіка. - С. 1 ; Народная трыбуна. - 2012. - 27 красавіка. - С. 2 ; Заря. - 2012. - 3 мая.- С. 4 ; Брестский вестник. - 2012. - 10 мая. - С. 6.

**Казакова, А.** Михаил Гольцман: «К работе - с любовью, к людям - с душой» / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2012. - 25 октября. - С. 5.

**Гольцман, А.** «Родны горад хочацца падтрымліваць заўсёды» / Андрэй Гольцман // Кобрынскі веснік. - 2011. - 16 ліпеня. - С. 3.

**Избраны** делегаты IV Всебелорусского народного собрания // Кобрынскі веснік. - 2010. - 9 ноября.

Гольцман А. М. избран от Кобринщины делегатом на IV Всебелорусское народное собрание.

**Лепшыя** прадпрымальнікі Кобрыншчыны // Кобрынскі веснік. – 2009. – 15 ліпеня. – С. 1

Указам Прэзідэнта Беларусі адзначаны лепшыя прадпрымальнікі краіны, сярод якіх дырэктар «ПП Палессе» А. Гольцман.

**Почётные** граждане. **Гольцман Андрей Михайлович** [Электронный ресурс] // Кобринский районный исполнительный комитет. – Режим доступа: http://kobrin.brest-region.gov.by. – Дата доступа: 11.03.2018.

# КАРАНЧУК
# ПАВЕЛ РЫГОРАВІЧ

**КАРАНЧУК Павел Рыгоравіч** (1924-2012) – Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна.



Нарадзіўся 11 кастрычніка 1924 года ў вёсцы Магдалін Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці) у сям'і сялян.

Да вайны атрымаў сямігадовую адукацыю. У 1936 годзе Павел закончыў чатыры класы Барысаўскай пачатковай школы, далей паступіў у пяты клас Кобрынскай польскай школы, дзе і закончыў сем класаў. Па заканчэнні рускамоўнай школы ў горадзе Кобрыне атрымаў у сельскім савеце накіраванне на вучобу ў г. Магілёў. Аднак вучыцца не прыйшлося: у самым пачатку лета памёр бацька, а праз два тыдні пачалася Вялікая Айчынная вайна.

Родная вёска стала зонай акупацыі, а каб выжыць, юнакам прыходзілася рабіць любую працу, у тым ліку капаць ямы для магіл расстраляных яўрэяў. Павел аказаўся ў спісах для адпраўкі на прымусовыя работы ў Германію, аднак змог збегчы ў лес. Тым часам фронт Чырвонай Арміі набліжаўся, у зоне акупацыі з'явілася ваенная разведка. Кемлівы юнак змог паказаць на ваеннай тапаграфічнай карце аб'екты фашыстаў.

Пасля вызвалення родных мясцін ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Павел Каранчук быў адпраўлены на аднаўленне Дняпроўска-Бугскага канала. З 1947 па 1948 год ён сакратар камсамольскай арганізацыі Кіселявецкага сельскага Савета. У 1949 годзе ўступіў у рады камуністычнай партыі.

З 1948 года (у 23 гады) Павел Каранчук быў выбраны першым старшынёй калгаса «Новы шлях» Кобрынскага раёна, які нязменна ўзначальваў на працягу 36 гадоў. Калгас «Новы шлях» быў у ліку тых гаспадарак, на базе якіх праводзіліся рэспубліканскія семінары па сельскай гаспадарцы. Першы сакратар ЦК КПБ Пётр Міронавіч Машэраў неаднаразова бываў у гэтай гаспадарцы. Дарэчы, з лёгкай рукі П. М. Машэрава ў гаспадарцы быў пабудаваны кормазавод.

Павел Рыгоравіч неаднаразова выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, чатыры скліканні выбіраўся дэпутатам Кобрынскага раённага Савета народных дэпутатаў, шмат разоў - дэпутатам Кіселявецкага сельскага Савета народных дэпутатаў. Яркі і плённы працоўны шлях П. Р. Каранчука адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі: ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», медалём «За доблесную працу. У адзначэнне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна».

П. Р. Каранчук выйшаў на пенсію ў 1984 годзе, аднак шмат добрых спраў паспеў зрабіць за сваю кіраўніцкую дзейнасць.

На пенсіі Павел Рыгоравіч таксама не сядзеў без справы, займаўся краязнаўчай працай. Невычэрпная працавітасць і аўтарытэт набылі яму павагу сярод людзей. З 1987 па 1988 год ён працаваў старшынёй раённага Савета ветэранаў, з 1997 па 2001 год - старастам в. Магдалін.

У 1985 годзе Павел Рыгоравіч захапіўся тапанімікай – навукай пра паходжанне геаграфічных назваў. У мясцовай газеце «Кобрынскі веснік» апублікаваны шэраг артыкулаў пад рубрыкай «Деревенька моя»; пісаў ўспаміны пра сябе, якія цесна перапляталіся з гісторыяй яго роду, вёскі, утварэння і станаўлення роднага калгаса.

У час падрыхтоўкі збору матэрыялаў да кнігі «Памяць. Кобрынскі раён» П. Р. Каранчук прымаў актыўны ўдзел у яе выданні.

Рашэннем Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта № 786 ад 18.08.2005 года Каранчуку Паўлу Рыгоравічу было прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

9 красавіка 2012 года П. Р. Каранчук памёр. Жыццё і дзейнасць Паўла Рыгоравіча Каранчука ўвайшлі ў гісторыю Кобрыншчыны як яркі прыклад самаадданай працы, адданага служэння людзям, вернасці грамадзянскаму абавязку і сваёй Радзіме.

### *Працы*

**Коренчук, П.** Деревенька моя... : [Дивин, Корчицы, Ор, Клетыще, Борисовка, Оса, Верхолесье, Ольховка, Забава, Бельск, Ходыничи] / Павел Коренчук // Кобрынскі веснік. - 2000. - 19 жніўня.- С. 2.

**Коренчук, П.** Деревенька моя... : [Топонимика: д. Босяч, Буховичи, Лепесы, Легаты, Дубовое, Лесково, Подолесье, Козище, Берёза, Залесье. Девятки, Селец, Закросница, Турная, Прилуки, Быстрица, Муховлоки, Колубели] / Павел Коренчук // Кобрынскі веснік. - 2000. - 26 жніўня. - С. 2.

**Коренчук, П.** Деревенька моя…: [Калюхи, Гирск, Болота, Заколнечье, Рыбна, Киселёвцы, Магдалин, Борисово, Брилёво] / Павел Коренчук // Кобрынскі веснік. - 2000. - 30 жніўня. - С. 2.

**Коренчук, П.** Деревенька моя...: [Новосёлки, Залесье, Девятки, Рынки, Тевли, Глинянки, Стригово, Стрижево, Литвинки, Литвиново, Мерница, Зауковье, Стасюки, Клещи, Батче. Тапаніміка] / Павел Коренчук // Кобрынскі веснік. - 2000. - 9 жніўня. - С. 3.

**Коренчук, П.** Деревенька моя...: [Шляхта, Остромичи, Ерёмичи, Жуховцы, Осовцы, Запруды, Подберье, Лука, Борки, Иловск, Шеметовка, Берёзно, Мазури, Смолярня, Плянта, Темра] / Павел Коренчук // Кобрынскі веснік. - 2000. - 16 жніўня. - С. 3.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**О присвоении** звания «Почетный гражданин Кобринского района» **Коренчуку Павлу Григорьевичу** : решение Кобринского районного исполнительного комитета, 18.08.2005 г., № 786 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 4. Оп. 6. Д. 820. Л. 192.

**О присвоении** звания «Почетный гражданин Кобринского района» **Коренчуку Павлу Григорьевичу** : решение Кобринского районного Совета депутатов, 18.08.2005 г., № 99. – Кобрин, 2005.

**О награждении** Почетной грамотой и Грамотой Верховного Совета Белорусской ССР работников сельского хозяйства республики **Коренчука Павла Григорьевича** : Указ Президиума Верховного Совета Белорусской ССР // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 4. Оп. 1. Д. 1103. Л. 4.

**О награждении** орденами и медалями СССР передовиков животноводства Белорусской ССР : выписка из Указа Президиума Верховного Совета СССР // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 4. Оп.Т. Д. 419. Лл. 38, 39, 41.

**О награждении** юбилейной медалью «За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина» **Коренчука Павла Григорьевича** : постановление Брестского обкома КПБ, исполкома Брестского областного Совета депутатов трудящихся, президиума областного Совета профсоюзов, 27 марта 1970 г., № 58-а // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 4. Оп. 1. Д. 594. Лл. 1, 8, 9, 54, 55, 78, 80, 88.

**Ардэнаносцы**. **Каранчук Павел Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 427. – (Вызначыліся працай).

**Долготович, Б. Д.** Коренчук Павел Григорьевич / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 30-31.

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Павел Григорьевич Коренчук** // Они награждены орденом Ленина : альбом. - Кобрин, 1981.

**Каранчук Павел Рыгоравіч** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 20-21 : фат.

**Каранчук Павел Рыгоравіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук. – Кобрын, 2018. – С. 38-41.

**95 гадоў** з дня нараджэння П. Р. Каранчука // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 99.

**Ганарымся** земляком. **Павел Рыгоравіч Каранчук** // Каб не абарвалася нітка памяці**…** : нарыс аб краязнаўцах Кобрыншчыны / УК «Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка», аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2009. – С. 34-38.

**Муха, Ф.** По новому пути / Федор Муха ; фото Александра Шульгача // Заря. – 2020. – 13 июня (№ 48). – С. 17.

Под руководством П. Г. Коренчука колхоз «Новый путь» быстро стал одним из показательных на Брестчине.

**Коренчук Павел Григорьевич** // Кобрынскі веснік. – 2012. - 14 красавіка. – С. 12.

9 апреля ушел из жизни Почётный гражданин Кобринского района П. Г. Коренчук.

**Сацук, А.** Рождённый октябрём / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. - 2010. - 6 лістапада. - С. 2.

Трудовая деятельность П. Г. Коренчука – это целая историческая эпоха в биографии нашей страны.

**Шевченко, А**. Судьба председателя / Алла Шевченко // Кобрин-информ. – 2007. - 3 мая. – С. 3.

Павел Григорьевич Коренчук - почетный гражданин Кобринского района, кавалер ордена Ленина и «Знак Почета».

**Коренчук, П.** «Не все умеют командовать…А руководить - это, знаете ли, искусство» / Павел Коренчук ; [беседовала] Валерия Корыстина // Кобрынскі веснік. – 2005. – 17 снежня. – С. 3.

Интервью с Почетным гражданином Кобринского района Павлом Григорьевичем Коренчуком.

**Почётные** граждане Кобринского района // Кобрынскі веснік. – 2005. – 24 жніўня.

О присвоении звание «Почётный гражданин Кобринского района» Коренчуку Павлу Григорьевичу, Сухареву Владимиру Ивановичу.

**Петров, П.** Из одного металла льют медаль за бой, медаль за труд / Петр Петров // Заря. - 2004. – 24 февраля.

Богата Кобринщина на людей, ставших ее гордостью и славой, в их числе и Павел Григорьевич Коренчук.

**Коренчук Павел Григорьевич** // Список почетных граждан города Кобрина, Кобринского района / Отдел идеологической работы Кобринского исполкома. – Кобрин, 2002. – С. 3.

# КЕНДА МІКАЛАЙ АЛЯКСЕЕВІЧ

**КЕНДА Мікалай Аляксеевіч** нарадзіўся 15 студзеня 1951 года ў вёсцы Вялікае Міжлессе Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці.



Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію па спецыяльнасці «гідрамеліярацыя». Пачынаў сваю працоўную дзейнасць на пасадзе майстра ПМК-17 трэста «Пінсксаўгасбуд» (г. Бяроза). Затым працаваў галоўным інжынерам і начальнікам перасовачнай механізаванай калоны ў г. Іванава.

З 1986 па 1995 год кіраваў калгасам «Кастрычнік» (Іванава). У 1995-1998 гадах - намеснік старшыні Брэсцкага райвыканкама. На працягу пяці гадоў кіраваў упраўленнем бытавога абслугоўвання Брэсцкага аблвыканкама.

У 2002 годзе стаў старшынёй Камянецкага раённага выканаўчага камітэта.

У 2004 годзе Мікалай Аляксеевіч узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».

З 2005 па 2013 год М. А. Кенда – старшыня Кобрынскага райвыканкама. Пад яго кіраўніцтвам быў праведзены шэраг арганізацыйных мерапрыемстваў, якія дазволілі дасягнуць станоўчых зменаў у дзейнасці прадпрыемстваў і арганізацый Кобрынскага раёна.

У перыяд правядзення рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2009» М. А. Кенда актыўна працаваў па добраўпарадкаванні горада і сельскіх населеных пунктаў, рамонту і будаўніцтву будынкаў сацыяльна-культурнага прызначэння. Было заасфальтавана 120 кіламетраў дарог, пракладзена 62 кіламетры інжынерных сетак, адрамантавана 198 жылых дамоў, пабудаваны новыя сучасныя аб’екты: Палац культуры, аздараўленчы цэнтр з водагразелячэбніцай «Аквапарк», Лядовая арэна, амфітэатр, рэканструяваны стадыён, гасцініца. Таксама штогод праводзіліся вялікія аб’ёмы работ па будаўніцтву аграгарадкоў.

Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў ад 10 студзеня 2020 года № 86 «Аб прысваенні звання «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна» за выдатны асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё раёна і грамадскую дзейнасць Кендзе Мікалаю Аляксеевічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Бялоў, Д.** Слаўся, Кобрыншчына, працай людзей! / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2020.– 22 студзеня (№ 5). – С. 1, 2.

За выдатны асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё раёна званне «Ганаровы грамадзянін Кобрыншчыны» прысвоена быломy старшыні райвыканкама М. Кендзе і дырэктару ААТ «Грушаўскі рамонтна-механічны завод» П. Папроцкаму.

**Избраны** делегаты IV Всебелорусского народного собрания // Кобрынскі веснік. - 2010. -9 ноября.

Кенда Николай Алексеевич, председатель Кобринского районного исполнительного комитета, избран от Кобринщины делегатом на IV Всебелорусское народное собрание.

**Кенда, Н. А.** Слово делегату: Кобринщина на пути созидания / [Николай Кенда ; беседовал] Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2010. – 6 декабря.

**Кенда, Н.** Николай Кенда: «Легко управлять районом, когда тебя понимают…» / Николай Кенда ; [беседовала] Елена Жук // Вечерний Брест. – 2009. – 23 января.

**Кенда, Н. А.** «Объединив усилия, мы сможем решить многие проблемы кобринского региона» / Николай Кенда ; [беседовала] Наталья Васюк // Кобрин-информ. – 2005. – 8 декабря. – С. 2.

**Васюк, Н**. Три «Д» нового председателя / Наталья Васюк // Кобрин-информ. – 2005. – 8 декабря (№ 49). – С. 1-2.

На сессии Кобринского районного Совета депутатов в должности председателя Кобринского райисполкома был утвержден Кенда Николай Алексеевич.

**В районном** Совете депутатов // Кобрынскі веснік. – 2005. – 7 снежня.

На должность председателя Кобринского РИК назначен Н. А. Кенда.

**Кенда Николай Алексеевич** [Электронный ресурс] // Кобринский районный исполнительный комитет. – Режим доступа: http://kobrin.brest-region.gov.by. – Дата доступа: 28.09.2020.

# КЛАЧКОВІЧ
# МАРЫЯ МІКАЛАЕЎНА

**КЛАЧКОВІЧ Марыя Мікалаеўна** нарадзілася 9 чэрвеня 1946 года ў вёсцы Леснікі Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці.



Настаўніцкую дзейнасць пачала ў 1965 годзе піянерскай важатай у Лясковіцкай 8-гадовай школе Іванаўскага раёна пасля няўдалай спробы паступіць у Брэсцкі педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна. Паспяховае (праз год) паступленне на хіміка-біялагічны факультэт таго ж педінстытута ператварыла намеры ў рэальнасць.

У Бельскай базавай школе Кобрынскага раёна яна рабіла свае першыя крокі ў прафесіі – выкладала хімію і біялогію. З 1969 па 1981 год працавала настаўнікам, дырэктарам Бельскай васьмігадовай школы. Ад вопытных педагогаў і мудрых вяскоўцаў атрымала жыццёвыя ўрокі, якімі заўсёды карысталася. Галоўныя з іх – з самаадданасцю працаваць, з павагай адносіцца да калег, з любоўю да блізкіх.

З 1981 года Марыя Мікалаеўна працавала ў Кобрынскім прафесійна-тэхнічным вучылішчы № 153 тэкстыльшчыкаў: спачатку намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце, з лістапада 1983 года па ліпень 2007 года з'яўлялася яго дырэктарам. Работа на пасадзе дырэктара Кобрынскага дзяржаўнага ліцэя сферы абслугоўвання, якой было аддадзена шмат гадоў, стала сэнсам яе жыцця. З камандай аднадумцаў рабіла ўсё, каб ліцэй быў лепшым не толькі ў вобласці, але і ў рэспубліцы. У 1988 годзе навучальная ўстанова атрымала званні «Вучылішча высокай культуры», «Інтэрнат высокай культуры», а праз два гады калектыў быў узнагароджаны Пераходным сцягам Савета Міністраў і Міністэрства народнай адукацыі БССР. Імкнучыся глядзець на перспектыву, у 1999 годзе была адкрыта ліцэйная група з фізіка-матэматычным ухілам па кваліфікацыях «швачка», «кравец», у 2003 годзе - «аператар ЭВМ». Усё гэта садзейнічала павышэнню прэстыжу вучылішча, прыём здзяйсняўся на конкурснай аснове.

Значнай заслугай, як дырэктара, так і ўсяго калектыву, з’явілася пераўтварэнне ў 2004 годзе ПТВ-153 тэкстыльшчыкаў у дзяржаўны прафесіянальны ліцэй сферы абслугоўвання. З гэтага часу перад установай адкрыліся больш шырокія перспектывы, а вытворча-навучальны працэс выйшаў на новы якасны ўзровень.

Пад кіраўніцтвам М. М. Клачковіч ствралася і ўмацоўвалася вучэбна-матэрыяльная база для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных рабочых. Уся працоўная дзейнасць Марыі Мікалаеўны была накіравана на ўдасканаленне вучэбна-выхаваўчага працэсу, стварэнне ўмоў для развіцця асобы навучэнцаў, аптымізацыю метадычнай і выхаваўчай дзейнасці калектыву. Яна з'яўлялася членам метадычнага савету ліцэя, ініцыятарам укаранення ў вучэбна-выхаваўчы працэс сучасных тэхналогій навучання і выхавання, камп'ютарнай тэхнікі.

З пасады дырэктара ліцэя Марыя Мікалаеўна пайшла ў 2007 годзе, пакінуўшы пасля сябе цвёрды падмурак, які застаецца сённяшняму кіраўніцтву і працоўнаму калектыву ўмацоўваць, удасканальваць і ўтрымліваць яго высокую планку. Яшчэ амаль дзесяць гадоў М. М. Клачковіч працягвала педагагічную дзейнасць, працуючы ў якасці інспектара па кадрах і выкладчыка.

Грамадская дзейнасць заўсёды была неад'емнай часткай яе жыцця: сакратар камсамольскай арганізацыі калгаса «За Радзіму» Кобрынскага раёна, дэпутат мясцовага Савета народных дэпутатаў, прапагандыст маладзёжнага гуртка камбіната грамадскага харчавання, старшыня прафкама прафсаюзнай арганізацыі аддзела адукацыі. Неаднаразова М. М. Клачковіч з'яўлялася старшынёй ці намеснікам старшыні ўчастковай выбарчай камісіі па выбарах у мясцовыя Саветы і Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

За высокі прафесіяналізм, творчасць і наватарскі падыход у навучанні і выхаванні працоўных кадраў Клачковіч М. М. узнагароджана значком «Выдатнік прафтэхадукацыі БССР», Ганаровым знакам «За заслугі ў развіцці прафтэхадукацыі», Ганаровымі граматамі ўпраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за высокае педагагічнае майстэрства, значны ўклад ва ўдасканаленні навучальна-выхаваўчага працэсу ёй прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь».

У дзень 75-годдзя Кобрынскага раёна Клачковіч Марыі Мікалаеўне прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна» (рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў ад 13.01.2015 г., № 37).

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**О присвоении** звания «Почетный гражданин Кобринского района» **Клочкович Марие Николаевне** : решение Кобринского районного Совета депутатов, 13 янв. 2015 г., № 37. – Кобрин, 2015.

**О представлении** кандидатур на присвоение звания «Почетный гражданин Кобринского района» **Клочкович Марии Николаевны** : решение Кобринского районного исполнительного комитета**,** 6 января 2015 г., № 11. – Кобрин, 2015.

**Клачковіч Марыя Мікалаеўна** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 109-110 : фат.

**Клачковіч Марыя Мікалаеўна** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі: інжынер-праграміст П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 41-43.

**Бакун, А**. [ Марыя Клачковіч] / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2020. – 18 ліпеня (№ 55). – С. 4.

Марыя Клачковіч — Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна.

**Савчук, М.** Нитка, иголка и вдохновение / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2020. – 11 июня (№ 24). – С. 4.

М. Н. Клочкович, находясь на пенсии, посвятила себя творчеству вышивки картин.

**Бакун, А.** Каб зерне ўзышло / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. - 28 красавіка. – С. 4. – (Год малой радзімы).

Усё жыццё Марыі Клачковіч, Ганаровага грамадзяніна Кобрынскага раёна, заслужанага настаўніка Рэспублікі Беларусь, - гэта несупынная самаадданая праца.

**Бакун, А.** Калі шчасце - велічыня пастаянная / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. - 6 мая. - С. 15.

Актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Кобрыншчыны прымае М. М. Клачковіч, узнагароджаная высокімі тытуламі «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь» і «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

**Клачковіч, М.** Найперш патрабуючы з сябе... / [М. М. Клачковіч ; запісаў] Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2015. - 15 красавіка. - С. 4.

**Савчук, М**. Директор с неиссякаемой энергией / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 29 января. – 2015. – С. 4.

Звания «Почетный гражданин Кобринского района» была удостоена М. Н. Клочкович, заслуженный учитель Республики Беларусь.

**Сталі** грамадзянамі. Ганаровымі // Народная трыбуна. – 2015. – 23 студзеня. – С. 3.

Звання «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна» ўдастоены Марыя Клачковіч, Уладзімір Кузіч і Іван Мароз.

**Аб прысваенні** М. М. Клачковіч ганаровага звання «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь» // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2002. - № 8. – С. 6

**Віншуем** з узнагародай! // Заря. – 2002. – 8 августа.

Указам Прэзідэнта Беларусі за высокае педагагічнае майстэрства ганаровае званне «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь» прысвоена Клачковіч Марыі Мікалаеўне - дырэктару Кобрынскага прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча № 153 тэкстыльшчыкаў.

**Дзюрич, Э.** «Здравствуйте, Мария Николаевна» / Эмма Дзюрич // Заря. – 2002. – 17 октября.

**Прэм'ер-міністр** уручыў дзяржаўныя ўзнагароды // Настаўніцкая газета. – 2002. – 28 верасня.

Звання «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь» удастоена дырэктар Кобрынскага прафтэхвучылішча № 153 тэкстыльшчыкаў Марыя Клачковіч.

**Пянко, А.** Настаўніцкае шчасце / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2002. – 17 жніўня.

**Клюйко, А.** Лідэр : партрэт кіраўніка / А. Клюйко // Настаўніцкая газета. – 2001. – 6 снежня. – С. 2.

**Почётные граждане. Клочкович** Мария Николаевна [Электронный ресурс] // Кобринский районный исполнительный комитет. – Режим доступа: http://kobrin.brest-region.gov.by. – Дата доступа: 01.03.2018.

**Клочкович Мария Николаевна** [Электронный ресурс] // Брестский государственный университет имени Пушкина. – Режим доступа: http://www.brsu.by page/klochkovich-mariya-nikolaevna. – Дата доступа: 01.02.2018.

# КУЗІЧ
# УЛАДЗІМІР РЫГОРАВІЧ

**КУЗІЧ Уладзімір Рыгоравіч** нарадзіўся 23 лютага 1940 года ў в. Павіцце Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў мнагадзетнай сялянскай сям'і. Пасля заканчэння школы – служба ў арміі ў Кіеве.



У 1972 годзе закончыў факультэт прыродазнаўства Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна.

Працоўную дзейнасць пачаў з 1963 года ў г. Чалябінску (Расія), куды быў накіраваны па камсамольскай пуцёўцы на будаўніцтва металургічнага завода. Некалькі гадоў адпрацаваў там, а потым вярнуўся на Кобрыншчыну. З 1965 па 1971 год займаў пасады інструктара Кобрынскага райвыканкама, старшыні Павіццеўскага сельскага Савета. Гэты час Уладзімір Рыгоравіч успамінае як гады свайго станаўлення, назапашвання вопыту работы з людзьмі.

Усё жыццё У. Р. Кузіча звязана з сельскай гаспадаркай, праблемамі і клопатам сялянства. У 1971-1973 гадах працаваў намеснікам старшыні калгаса імя Чкалава Кобрынскага раёна (СВК «Верхалескі»). Паралельна закончыў курсы падрыхтоўкі кіраўнічых кадраў у Гродзенскім сельскагаспадарчым інстытуце.

1973 год стаў пераломным, ключавым у кар'еры маладога кіраўніка. У 33-х гадовым узросце Уладзімір Кузіч прызначаны на пасаду старшыні калгаса імя Дзімітрава Кобрынскага раёна (цяпер ААТ «Стрыгава»), якім ён кіраваў трыццаць пяць гадоў. Пры ім калгас увайшоў у дзясятку лепшых гаспадарак Брэстчыны. Дзякуючы высокім прафесійным і арганізатарскім здольнасцям Уладзіміра Рыгоравіча, правядзенню механізацыі і мадэрнізацыі вытворчасці, калгас штогод атрымліваў высокія паказчыкі ў вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі і раслінаводства. Уладзімір Рыгоравіч першым у раёне і адным з першых у вобласці перавёў ААТ «Стрыгава» на гаспадарчы падрад. Ён скрупулёзна вывучаў вопыт лепшых аграрнікаў не толькі Беларусі і блізкага замежжа, але і краін Еўропы: Германіі, Польшчы, Францыі, Даніі, Балгарыі. Паглядзець на ферму, пабудаваную па самых перадавых еўрапейскіх тэхналогіях, прыязджалі ў тыя часы нават з вобласці.

Асноўную ўвагу старшыня надаваў не толькі вытворчай, але і сацыяльнай сферы. Шмат чаго рабілася ў плане добраўпарадкавання населеных пунктаў, якія ўваходзілі ў склад калгаса: асфальтаваліся дарогі, газіфіцыравалася в. Стрыгава, будаваліся дзясяткі сучасных дамоў, царква, Дом культуры, кафэ, ФАП, лазня. Людзі атрымлівалі годную зарплату за сваю працу і мелі магчымасць для паўнацэннага адпачынку. У. Р. Кузіч пайшоў на заслужаны адпачынак у 68 гадоў, пакінуўшы квітнеючым не толькі гаспадарку, але і цэнтральную сядзібу вёскі Стрыгава.

У. Р. Кузіч актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці раёна. З 1991 па 2000 год з'яўляўся старшынёй Савета калгасаў Брэсцкай вобласці, з 2000 па 2009 год - старшынёй Брэсцкага аграпрамысловага саюза. Тройчы выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў. У перыяды дэпутацкай дзейнасці ўзначальваў пастаянную камісію па сельскай гаспадарцы абласнога Савета дэпутатаў. З красавіка 2011 года і па сённяшні дзень Уладзімір Рыгоравіч - старшыня Кобрынскай раённай арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.

За працоўныя заслугі неаднаразова ўзнагароджваўся дзяржаўнымі ўзнагародамі: ордэны «Знак Пашаны» (1978) і «Працоўнага Чырвонага Сцяга» (1986), юбілейны медаль да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна «За доблесную працу» (1970). У 1999 годзе прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь». У 2007 годзе У. Р. Кузічу аб’яўлена Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за мужнасць і адвагу, праяўленую ў выратаванні дзяцей на вадаёме.

У дзень 75-годдзя Кобрынскага раёна рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 37 ад 13 студзеня 2015 года Кузічу Уладзіміру Рыгоравічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

### *Аб жыцці і дзейнасці*


**Заслужаныя** работнікі Беларусі. **Кузіч Уладзімір Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 429 – (Вызначыліся працай).

**Известные** люди. **Кузич Владимир Григорьевич** // Азбука моей малой родины : 505-летию д. Стригово посвящается / Кобринская районная централизованная библиотечная система. Учреждение культуры «Стриговская публичная библиотека», Отдел образования, спорта и туризма Кобринского райисполкома. Учреждение образования «Стриговский детский сад - средняя школа», Стриговский центр культуры и досуга ; под ред. С. Д. Курачук. – Кобрин, 2018. – С. 13.

**Кузич Владимир Григорьевич** // Кто есть Кто в Республике Беларусь : справочное издание / под ред. И. В. Чекалова. – Минск, 2005. – Т. 2. – С. 186.

**Кузіч Уладзімір Рыгоравіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук. – Кобрын, 2018. – С. 43-45 : фат.

**Кузіч Уладзімір Рыгоравіч** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 130-132 : фат.

**Ширко, В.** Стриговские горизонты : документальная повесть о Заслуженном работнике сельского хозяйства Республики Беларусь В. Г. Кузиче / Василь Ширко. – Минск : Парадокс, 2017. – 191 с. : ил.

**80 гадоў** з дня нараджэння У. Р. Кузіча (1940) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 140-141.

**Бакун, Е.** В буднях великих строек / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2020. – 22 лютага (№ 14). – С. 4 : фот.

Жизненные горизонты Владимира Кузьмича.

**Курец, А.** Делай, как Кузич! / Александр Курец // Сельская газета. – 2020. – 25 февраля (№ 22). – С. 8 : фот.

Заслуженный работник сельского хозяйства Беларуси В. Г. Кузич, 35 лет возглавлявший ОАО «Стригово» Кобринского района, отметил 80-летний юбилей.

**Курец, А.** Помочь молодым аграриям / Александр Курец // Сельская газета. - 2019. — 29 июня. — С. 26 : фот.

Заслуженный работник сельского хозяйства Беларуси В. Г. Кузич принимал участие во встрече с молодыми специалистами организаций агропромышленного комплекса Брестчины.

**Бакун, А.** Заўсёды ў страі / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. – 7 лютага. – С. 5.

Гутарка са старшынёй Кобрынскага раённага савета ветэранаў У. Р. Кузічам.

**Ширко, В.** Грести против течения / Василий Ширко // Сельская газета. - 2018. – 9 января. – С. 15 : фото.

Фрагменты из книги В. Ширко о Владимире Кузиче.

**Бакун, Е.** Поклон земле и людям уважение / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. - 21 студзеня. - С. 4.

О действующем председателе районного совета ветеранов Кобринского района В. Г. Кузиче.

**Курец, А.** Вот вам моя рука / Александр Курец ; фото Ирины Лесик // Сельская газета. - 2015. - 24 февраля. - С. 4.

О В. Г. Кузиче, бывшем руководителе ОАО «Стригово», Почетном гражданине Кобринского района, главном специалисте Брестского областного агропромышленного союза.

**Кузич, В.** Учитель по образованию 35 лет возглавлял колхоз / Владимир Кузич ; [записала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2015. – 12 февраля (№.7) – С. 4 : фото.

Биография Владимира Григорьевича Кузича, Почетного гражданина Кобринского района, председателя колхоза «Стригово».

**Сталі** грамадзянамі. Ганаровымі // Народная трыбуна. – 2015. – 23 студзеня. – С. 3.

Звання «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна» ўдастоены Марыя Клачковіч, Уладзімір Кузіч і Іван Мароз.

**Лесик, И.** Сегодня, как и много лет назад / Ирина Лесик // Кобрынскі веснік. – 2014. – 3 снежня. – С. 2 : фото.

**Сацук, А.** Этапы большого пути / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. – 2010. – 15 студзеня. – С. 2-3.

Заслуженный работник сельского хозяйства Владимир Кузич отработал руководителем колхоза имени Димитрова 35 лет и один день.

**Можаровская, Е.** «Созрел, как яблоко на ветке» / Елена Можаровская // Вечерний Брест. - 2008. - 14 ноября. - С. 5.

О бывшем председателе ОАО «Стриговский» В. Кузиче.

**Падзяка** за мужнасць // Кобрынскі веснік. – 2007. – 30 чэрвеня.

За мужнасць і адвагу, праяўленыя пры выратаванні дзяцей на вадаёме, Прэзідэнт аб'явіў Падзяку дырэктару ААТ «Стрыгава» Уладзіміру Кузічу.

**Бунеева, Л.** Директор ОАО «Стригово» Владимир Кузич: «Любимое время – весна» / Людмила Бунеева // Вечерний Брест. - 2007. - 6 апреля. - С. 5.

**Труд** и талант – родному Отечеству : Президент Республики Беларусь А. Лукашенко вручил государственные награды 50 представителям различных сфер деятельности // Народная газета. – 2007. – 2 лістапада. – С. 2.

Директору ОАО «Стригово» В. Кузичу объявлена благодарность Президента.

**Хокимова, А**. Битва за хлеб … и за жизнь / Антонина Хокимова // Вечерний Брест. – 2006. – 2 августа.

Директор ОАО «Стригово» В. Кузич спас двух тонувших девочек.

**Васюк, Н.** Мечта председателя / Наталья Васюк // Кобрин-информ. – 2004. – 18 ноября. – С. 3.

**Жук, Е.** «На жизнь обижаться не за что …» / Елена Жук // Кобрынскі веснік. - 2002. – 25 мая. – С. 1, 3.

Фамилия председателя колхоза имени Димитрова В. Г. Кузича на слуху у кобринчан почти тридцать лет.

**Архипова, А**. Этюд в красных тонах / Ада Архипова // Заря. – 2002. – 15 июня.

В облисполкоме состоялось чествование лучших тружеников области, удостоенных почетного звания «Человек года», в агропромышленном комплексе - председатель колхоза имени Димитрова Кобринского района Владимир Кузич.

**Лучший** председатель года // Заря. – 2001. – 22 марта.

За большой личный вклад в развитие сельскохозяйственного производства области, укрепление экономики хозяйств объявлена благодарность председателю колхоза имени Димитрова Кобринского района В. Г. Кузичу.

**Юнцевич, А.** Председателю колхоза имени Димитрова Кобринского района, председателю Брестского областного совета колхозов Кузичу В. Г. / А. Юнцевич // Белорусская нива. – 1998. - № 54.

Поздравление В. Г. Кузичу с 25-летним юбилеем плодотворной работы на посту председателя колхоза имени Димитрова Кобринского района.

**Кузич, В.** «На то она и жизнь, чтобы ставить вопросы. А мы в ней - чтобы их решать» / Владимир Кузич ; [беседовала] Ольга Бородина // Заря. – 1997. – 8 декабря. – С. 2.

**Кузич** Владимир Григорьевич // Кобрынскі веснік. – 1995. – 6 мая. – С. 2.

О кандидате в депутаты В. Г. Кузиче, его предвыборная программа.

**Почётные** граждане. **Кузич Владимир Григорьевич** [Электронный ресурс] // Кобринский районный исполнительный комитет. – Режим доступа: http://kobrin.brest-region.gov.by. – Дата доступа: 11.03.2018.

**Кузич Владимир Григорьевич** [Электронный ресурс] // Брестский государственный университет имени Пушкина. – Режим доступа: http://www.brsu.by/page/klochkovich-mariya-nikolaevna. – Дата доступа: 11.02.2018.

**23 лютага** 2020 года – 80 гадоў з дня нараджэння (1940) **Уладзіміра Рыгоравіча Кузіча** [Электронны рэсурс] // Краязнаўства Берасцейшчыны. – Рэжым доступу: http://kb.brl.by. – Дата доступу: 28.05.2020.

# МАРОЗ
# ІВАН ПАЎЛАВІЧ

**МАРОЗ Іван Паўлавіч** нарадзіўся 22 сакавіка 1945 года ў вёсцы Свішчы Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці.



Сваю працоўную дзейнасць пачаў ў 1966 годзе майстрам Кобрынскага рамонтнага завода. Пасля заканчэння Пружанскага сельгастэхнікума і Беларускага політэхнічнага інстытута 20 гадоў працаваў на рамонтным заводзе, з 1969 па 1986 год - на пасадзе начальніка вытворча-дыспетчарскага аддзела завода.

У 1986 годзе Іван Мароз прызначаны кіраўніком Кобрынскай сельгастэхнікі. Пасля перайменавання ў адкрытае акцыянернае таварыства «Кобрынаграмаш» з 2003 года па жнівень 2014 года быў дырэктарам прадпрыемства. Без малога 30 гадоў ён кіраваў прадпрыемствам з колькасцю работнікаў каля 750 чалавек. Пад кіраўніцтвам Івана Паўлавіча калектыў ААТ дасягнуў высокіх эканамічных і вытворчых паказчыкаў.

Аб дасягненнях гэтага таленавітага кіраўніка шмат пісалі ў прэсе. Паспяховае ў савецкі час прадпрыемства, якое два гады запар займала першае месца ва Усесаюзным спаборніцтве, вытрымала выпрабаванне і пасля развалу СССР.

За сваю працоўную дзейнасць, прафесіяналізм І. П. Мароз адзначаўся на самым высокім узроўні. У 1987 годзе Іван Паўлавіч узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць», у 1989 годзе - медалём «Ветэран працы». У 1999 годзе І. П. Мароз удастоены ордэна Пашаны, у 2004 годзе - ордэна Айчыны III ступені.

Іван Паўлавіч сышоў на заслужаны адпачынак у 69 гадоў. Прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці раёна. Неаднаразова выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога і Кобрынскага раённага Саветаў дэпутатаў. Па выніках працы за 2007 год занесены на раённую Галерэю Працоўнай Славы раёна ў прамысловасці.

Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 37 ад 13 студзеня 2015 года за асабісты ўклад у развіццё эканомікі раёна Марозу Івану Паўлавічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

### *Аб жыцці і дзейнасці*


**Мороз Иван Павлович** // Кто есть Кто в Республике Беларусь : справочное издание / под ред. И. В. Чекалова. – Минск, 2005. – Т. 2. – С. 239.

**Мароз Іван Паўлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі : інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 45-47.

**Мароз Іван Паўлавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 62-63.

**Савчук, М**. Иван Мороз: «Скучать мне не приходится» / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2020. – 2 июля. – С. 4.

Почетный гражданин Кобринского района, бывший директор ОАО «Кобрин-агромаш» И. П. Мороз, находясь на пенсии, занимается садоводством и пчеловодством.

**Кузина, С.** Навечно сохраним / Светлана Кузина // Кобрынскі веснік. - 2018. - 6 кастрычніка. - С. 4.

Почетный гражданин Кобринского района И. Мороз подарил архиву свои документы.

**Бакун, Е.** Где дело само за себя говорит / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. - 5 красавіка. - С. 5.

Почетный гражданин Кобринского района И. П. Мороз прошел путь от рядового техника-механика до управляющего предприятия.

**Лесик, И.** Союз оказался прочным / Ирина Лесик // Кобрынскі веснік. – 2015. – 14 студзеня. – С. 4.

Заслуги И. П. Мороза, 28 лет руководившего коллективом ОАО «Кобринагромаш», отмечены орденом, медалями и уважением коллег.

**Савчук, М.** Трудовой стаж длиной в полвека / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2015. - 5 февраля. - С. 4.

Трудовой путь И. П. Мороза, 28 лет возглавлявшего коллектив сельхозтехники, отмечен званием **«**Почетный гражданин Кобринского района**»**.

**Сталі** грамадзянамі. Ганаровымі // Народная трыбуна. – 2015. – 23 студзеня. – С. 3.

Звання «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна» ўдастоены Марыя Клачковіч, Уладзімір Кузіч і Іван Мароз.

**Мароз, І.** «Гораду патрэбна наша праца» / Іван Мароз // Кобрынскі веснік. – 2012. – 21 ліпеня. – С. 4.

**Мороз, И.** Многовекторность как фактор стабильности / [Иван Мороз ; беседовал] Юрий Бехтерев // Директор. – 2011. – 30 мая.

**Мельнік, Р.** Іван Мароз: «Я заўсёды жыву праблемамі вёскі» / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2010. – 24 лютага. – С. 2.

**Мороз, И.** «Нынешний финансовый кризис по сравнению с началом 90-х - мелочи» / Иван Павлович Мороз ; [беседовал] Сергей Волков // Заря. - 2010. - 27 марта. - С. 3.

**Сацук, А.** Треугольник успеха / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. – 2006. – 27 верасня. – С. 1, 2.

Более 20 лет возглавляет ОАО «Кобринский завод агропромышленного машиностроения» директор Иван Павлович Мороз.

**А у нас** такой земляк! // Кобрынскі веснік. – 2005. – 6 студзеня.

Директор ОАО «Кобринагромаш» И. П. Мороз награжден орденом Отечества III степени.

**Почётные** граждане. **Мороз Иван Павлович** [Электронный ресурс] // Кобринский районный исполнительный комитет. – Режим доступа: http:// kobrin. brest-region.gov.by. – Дата доступа: 01.03.2018.

# ПАПРОЦКІ
# ПЁТР СЯРГЕЕВІЧ



**ПАПРОЦКІ Пётр Сяргеевіч** нарадзіўся 10 чэрвеня 1957 года ў вёсцы Мазуры Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці.

Пасля заканчэння Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута ў 1979 годзе пачаў сваю працоўную дзейнасць майстрам Ляхавіцкага ПМК-12.

З 1981 года працуе ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Грушаўскі рамонтна-механічны завод». З 12 лютага 1999 года і па цяперашні час з'яўляецца дырэктарам прадпрыемства. Пад яго кіраўніцтвам на прадпрыемстве ўсе гэтыя гады высокі ўзровень працоўнай дысцыпліны і адказнасці работнікаў. Вядзецца мэтанакіраваная праца па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы арганізацыі, дасягненні прагнозных паказчыкаў.

Па ініцыятыве Пятра Сяргеевіча на прадпрыемстве вядзецца работа па пашырэнні асартыменту выпускаемай прадукцыі, рацыянальным выкарыстанні працоўнага часу. Надаецца ўвага эканомнаму выкарыстанню матэрыяльна-тэхнічных і паліўна-энергетычных рэсурсаў, энерга-зберажэнню, атрыманню запланаванага аб'ёму прыбытку, рэнтабельнасці вытворчасці, што спрыяе вырашэнню сацыяльных пытанняў у інтарэсах калектыву. Прадпрыемства пад кіраўніцтвам П. С. Папроцкага працуе стабільна, з добрымі вытворчымі паказчыкамі.

На прадпрыемстве праводзіцца работа па павышэнні якасці прадукцыі, укаранёна сістэма менеджменту якасці СТБ ISO 9001-2015.

Пётр Сяргеевіч прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Кобрынскага раёна. Неаднаразова выбіраўся дэпутатам раённага і сельскага Савета дэпутатаў. У цяперашні час выбраны дэпутатам Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў XXVIII склікання.

П. С. Папроцкі ўзнагароджваўся ганаровымі граматамі Дэпартамента па меліярацыі і воднай гаспадарцы, ГА «Брэстмеліявадгас», Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта, Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта.

Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 86 ад 10 студзеня 2020 года за выдатны асабісты ўклад у развіццё эканомікі раёна Папроцкаму Пятру Сяргеевічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Бялоў, Д.** Слаўся, Кобрыншчына, працай людзей! / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2020. – 22 студзеня (№ 5). – С. 1-2.

За выдатны асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё раёна званне «Ганаровы грамадзянін Кобрыншчыны» прысвоена былому старшыні райвыканкама Мікалаю Кендзе і дырэктару ААТ «Грушаўскі рамонтна-механічны завод» Пятру Папроцкаму.

**Семенов, С.** Мы беремся за любую работу / Сергей Семенов // Брестский калейдоскоп. – 2020. – № 3 (март). – С. 3 : фот.

За неоценимый личный вклад в развитие экономики Кобринщины директороу «Грушевкого РМЗ» П. С. Папроцкому присвоено звание «Почетный гражданин Кобринского района».

**Белов, Д.** Петр Папроцкий: «За свое дело и свой регион нужно болеть душой!» / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2019. — 11 верасня. — С. 1-2 : фот.

За высокие достижения директор ОАО «Грушевский РМЗ» Пётр Папроцкий занесён на районную Доску почёта.

**Папроцкий, П. С.** Грушевский РМЗ: уникальность и перспективы / П. С. Папроцкий, беседовал Игорь Сидорук // Кобрынскі веснік. – 2015. - 7 лютага. – С. 3.

**Гром, А.** Авторитет подтверждается качеством / Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2010. - 13 лістапада. - С. 2.

О работе ОАО «Грушевский РМЗ», директор Петр Попроцкий.

# СУХАРАЎ УЛАДЗІМІР ІВАНАВІЧ

**СУХАРАЎ Уладзімір Іванавіч** нарадзіўся 14 жніўня 1947 года ў Маскве.



Закончыў Маскоўскі юрыдычны інстытут. Прайшоў службу ў радах Савецкай Арміі.

З 1971 па 1975 год працаваў у Чаромушкінскім райкаме камсамола г. Масквы. З 1975 па 1979 год - старшыня Чаромушкінскага раённага камітэта Добраахвотнага таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту г. Масквы.

Доўгі час Уладзімір Іванавіч узначальваў дырэкцыю Чаромушкінскага вытворча-жыллёвага рамонтнага аб'яднання г. Масквы. Шмат увагі надаваў пытанням працаўладкавання насельніцтва, кіраваў службай занятасці г. Масквы.

У 1989 годзе заснаваў асацыяцыю «Інтэртрэйнінг».

З 1991 года Сухараў з'яўляецца сустаршынёй – выканаўчым дырэктарам Міжнароднага форуму «Сусветны вопыт і эканоміка Расіі», у рамках якога правёў больш за 100 буйнамаштабных усерасійскіх і міжнародных кангрэсаў, сімпозіумаў, канферэнцый у Маскве.

Займаецца пытаннямі пашырэння супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы з краінамі Бліжняга Усходу і Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёну. З'яўляецца віцэ-прэзідэнтам міжнароднага грамадскага руху «Восточное измерение». Надае шмат увагі пытанням дзейнасці Асамблеі дзелавых колаў «Расія - Ліван» на пасадзе генеральнага сакратара. З'яўляецца віцэ-прэзідэнтам англійскага Інстытута фінансавых аналітыкаў.

Прымае актыўны ўдзел у навуковых пошуках. З'яўляецца членам Міжнароднай акадэміі менеджменту, прафесарам акадэміі інфармацыйных працэсаў і тэхналогій, членам Міжнароднай акадэміі навук «Праблемы інтэлектуальнага развіцця», членам Міжнароднай акадэміі эканомікі і фінансаў.

У. І. Сухараў мае ганаровыя ўзнагароды Прэзідэнта Расіі, Дзяржаўнай Думы, урада Расійскай Федэрацыі.

З 1991 года Уладзімір Іванавіч Сухараў актыўна ўдзельнічае ў жыцці Кобрына, у падрыхтоўцы і правядзенні гарадскіх святаў, праводзіць вялікую работу па прыцягненні інвестыцый для эканамічнага развіцця рэгіёна, яго прадпрыемстваў, устаноў, аказвае дапамогу жыхарам і прадпрымальнікам Кобрыншчыны. У 2005 годзе У. І. Сухараў прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні Міжнароднага інвестыцыйнага форуму «Кобрын-Інвест».

За вялікі асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё Кобрыншчыны, умацаванне дзелавых і сяброўскіх сувязяў двух братэрскіх народаў Беларусі і Расіі ў 2005 годзе Сухараву Уладзіміру Іванавічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна» (рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў ад 18.08.2005 г., № 99).

***Аб жыцці і дзейнасці***

**О присвоении** звания «Почетный гражданин Кобринского района» **Сухареву Владимиру Ивановичу** : решение Кобринского районного исполнительного комитета, 18.08.2005 г., № 786 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 4. Оп. 6. Д. 820. Л. 192.

**Долготович, Б. Д.** Сухарев Владимир Иванович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 33.

**Сухараў Уладзімір Іванавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп’ютарны дызайн вокладкі : інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 47-48.

**Неповторимый** колорит дружбы // Кобрынскі веснік. – 2007. – 25 ліпеня. – С. 1.

В августе 2005 года за большой личный вклад в социально-экономическое развитие Кобринщины, укрепление связей двух братских народов Беларуси и России В. И. Сухарев удостоен звания Почетного гражданина Кобринского района.

**Почётные** граждане Кобринского района // Кобрынскі веснік. – 2005. – 24 жніўня.

О присвоении звание «Почётный гражданин Кобринского района» Коренчуку Павлу Григорьевичу, Сухареву Владимиру Ивановичу.

**Сухарев Владимир Иванович** // Список почетных граждан города Кобрина, Кобринского района / Отдел идеологической работы Кобринского исполкома. – Кобрин, 2002. – С. 3-4.

**Почетные** граждане города Кобрина и Кобринского района. **Сухарев Владимир Иванович** [Электронный ресурс] // Туристический Кобрин. – Рэжым доступу: http://ikobrin.ru/gragdane.php. – Дата доступу: 05.09.2018.

# ЧЫРУН
# СВЯТЛАНА ІОСІФАЎНА

**ЧЫРУН Святлана Іосіфаўна** нарадзілася 2 сакавіка 1956 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. З сямі гадоў займалася ў Доме піянераў. Пасля васьмі класаў паступіла на аддзяленне харэаграфіі Гродзенскага культасветвучылішча, якое закончыла ў 1974 годзе.



Працуе педагогам дадатковай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці» з 1974 года і з'яўляецца нязменным кіраўніком узорнага танцавальнага калектыву «Пралесачкі».

За гады педагагічнай дзейнасці Святлана Іосіфаўна зацікавіла мясцовым фальклорам, народным танцам сотні хлопчыкаў і дзяўчынак, дабілася высокіх вынікаў у пастановачнай працы. Яна шырока прапагандуе сваё прафесійнае майстэрства сярод маладых харэографаў, калег, праводзіць майстар-класы ў рамках Рэспубліканскага фестывалю «Юныя таленты Беларусі». Больш за 30 выхаванцаў калектыву сталі прафесійнымі харэографамі і працягваюць сваю творчую дзейнасць.

Метадычны матэрыял з вопыту работы кіраўніка па вывучэнні фальклору Кобрыншчыны «Скарбонка народных танцаў» быў адзначаны Дыпломам II ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь на XIV выставе навукова-метадычнай літаратуры і педагагічнага вопыту па тэме «Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне: вопыт і перспектывы».

Святлана Іосіфаўна пастаянна знаходзіцца ў творчым пошуку, умее аб'яднаць калектыў, дасягнуць высокіх вынікаў у працы, наладзіць добразычлівыя адносіны з выхаванцамі, бацькамі, калегамі.

Дзякуючы яе прафесіяналізму, настойлівасці і творчасці, узорны танцавальны калектыў «Пралесачкі» ў 1995 годзе атрымаў званне «ўзорны» і кожныя тры гады пацвярджае высокае званне. Калектыў ведаюць не толькі ў нашым раёне, але і за яго межамі. Яны неаднаразовыя пераможцы абласных, рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў дзіцячай творчасці: рэспубліканскі конкурс маладых выканаўцаў «Беларускія таленты» (дыплом II ступені, 2014), рэспубліканскі конкурс «Юныя таленты Беларусі» (дыплом III ступені, 2015), міжнародны фестываль «Мы - разам» (дыпломы I і II ступені, 2015, дыплом III ступені, 2016), міжнародны фестываль-конкурс «Музыкі свет» (дыплом I ступені, 2015 і 2017, дыплом лаўрэата II ступені, 2017), міжнародны конкурс-фестываль мастацтваў «Васілёк» (дыплом II ступені, 2017), абласны этап рэспубліканскага фестывалю «Здравствуй, мир!» (дыпломы I і II ступені, 2017).

За добрасумленную працу Святлана Іосіфаўна ўзнагароджана Ганаровым сертыфікатам Брэсцкага аблвыканкама ў намінацыі «Педагагічная падтрымка адораным дзецям» (2005), Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь за добрасумленную працу ў сістэме адукацыі (2006), Нагрудным знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік адукацыі» (2011), Дыпломам за высокія творчыя

поспехі ў працы з дзецьмі Міжнароднага дзіцячага фестывалю «Сонца. Радасць. Прыгажосць» г. Несебер ў Балгарыі (2014), сертыфікатам Міжнароднага дзіцячага фестывалю «Солнце. Радость. Красота» г. Несебер ў Балгарыі (2014), Ганаровай граматай Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў (2014), Ганаровай граматай Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта (2014), Ганаровай граматай аддзела адукацыі, спорту і турызму Кобрынскага райвыканкама (2016).

Святлана Іосіфаўна Чырун - лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў за асабісты ўклад у развіццё здольнасцей таленавітай моладзі (2008).

Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў ад 20 чэрвеня 2017 года № 155 за выдатны асабісты ўклад у развіццё адукацыі раёна і грамадскую дзейнасць Чырун Святлане Іосіфаўне прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

***Аб жыцці і дзейнасці***

**О представлении** кандидатур на присвоение звания «Почетный гражданин Кобринского района» **Чирун Светланы Иосифовны** : решение Кобринского районного исполнительного комитета, 19 июня 2017 г., № 744. – Кобрин, 2017.

**Чырун Святлана Іосіфаўна** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп’ютарны дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 49-50.

**Хрышчановіч, Н.** Увесь год у цвіценні / Настасся Хрышчановіч // Настаўніцкая газета. – 2020. – 24 кастрычніка (№ 121). – С. 9.

Святлана Чырун кіруе ўзорным танцавальным калектывам «Пралесачкі» ў Кобрынскім раённым цэнтры дзіцячай творчасці ўжо 46 гадоў.

**Вовк, Ю.** «Пралесачкі»: 45 лет на гребне успеха / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2019. — 30 мая (№ 22). — С. 2.

Во всех победах образцового танцевального коллектива «Пралесачкі» заслуга не только самих детей, но и руководителя образцового коллектива «Пралесачкі» С. Чирун.

**Кузина, С.** Тренер творческой команды «Пралесачкі» / Светлана Кузина // Кобрин-информ. – 2019. – 28 ноября (№ 48). – С. 3.

Фонд Зонального государственного архива в г. Кобрине пополнился документами почетного гражданина Кобринского района С. И. Чирун.

**О присвоении** звания «Почетный гражданин Кобринского района» : решение Кобринского районного Совета депутатов, 20 июня 2017 г., № 155 // Кобрынскі веснік. – 2017. – 28 чэрвеня. – С. 1.

**Бакун, Е.** С Терпсихорой на «ты» / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. - 15 лістапада. - С. 5.

О руководителе образцового танцевального коллектива «Пралесачкі», Почетном гражданине Кобринского района С. Чирун.

**Казакова, А.** Через танец к духовному совершенствованию ведет своих учеников хореограф Светлана Чирун / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2017. - 27 июля. - С. 3.

Звание «Почетный гражданин Кобринского района» присвоено С. Чирун.

**Они** славят Кобринщину трудом // Кобрин-информ. - 2017. - 20 июля. – С. 2.

Звание «Почетный гражданин Кобринского района» присвоено А. Гольцману и С. Чирун.

**Мельнік, Р.** З юбілеем, «Пралесачкі!» / Раман Мельнік ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2014. — 14 чэрвеня. — С. 3.

Чатыры дзесяцігоддзі Святлана Чырун, карэнная кабрынчанка, прысвяціла ўзорнаму ансамблю танца «Пралесачкі» раённага цэнтра дзіцячай творчасці.

**Казакова, А.** Танец – это маленькая жизнь! / Анна Казакова // Кобрин-информ. – 2012. – 24 мая. – С. 2.

**Елизарова, Ж.** С танцем по жизни / Жанна Елизарова // Кобрин-информ. - 2011. - 22 сентября. - С. 26.

**О присвоении** звания «Почетный гражданин Кобринского района» Чирун Светлане Иосифовне : докладная записка / отдел образования, спорта и туризма Кобринского райисполкома. – Кобрин, 2015.

**Чирун Светлана Иосифовна** : справка-объективка / отдел образования, спорта и туризма Кобринского райисполкома. – Кобрин, 2015.

**Чирун Светлана Иосифовна** : характеристика / отдел образования, спорта и туризма Кобринского райисполкома. – Кобрин, 2015.

**Почётные** граждане. **Чирун Светлана Иосифовна** [Электронный ресурс] // Кобринский районный исполнительный комитет. – Режим доступа: http://kobrin.brest-region.gov.by. – Дата доступа: 11.08.2018.

**Доска** почёта педагогов. **Чирун Светлана Иосифовна** [Электронный ресурс] // Отдел по образованию Кобринского районного исполнительного комитета. - Режим доступа: http://kobrin.edu.by/ru/main.aspx?guid=6791. – Дата доступа: 12.08. 2018.

# ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ АГРАГАРАДКА ПАВІЦЦЕ

**БРЫШЦЕН МІКАЛАЙ РЫГОРАВІЧ**

**ЗАВЕРЖАНЕЦ МІКАЛАЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ**

**КАНЦЭВІЧ ІВАН УЛАДЗІМІРАВІЧ**

**КРЫВЕЦКІ МІКАЛАЙ АНАТОЛЬЕВІЧ**

**МІГІЦ ВАСІЛІЙ МІКАЛАЕВІЧ**

**САШКО ВЯЧАСЛАЎ ВАСІЛЬЕВІЧ**

**ЦЕЦЯРУК ІВАН МІКАЛАЕВІЧ**

**ЦЮЛІН УЛАДЗІМІР ГЕОРГІЕВІЧ**

**ЧОПІК ГАННА ВАСІЛЬЕЎНА**

Утверждено

Решение Повитьевского сельского
исполнительного комитета
31.10.2014 № 115

# ПОЛОЖЕНИЕ

## О порядке присвоения звания «Почётный гражданин агрогородка Повитье Кобринского района»

1. Звание «Почётный гражданин аг. Повитье Кобринского района» присваивается жителям агрогородка Повитье и лицам, проживающим за его пределами, за особые заслуги перед агрогородком.

Представление граждан к присвоению звания «Почётный гражданин аг. Повитье Кобринского района» осуществляется за значительный вклад в социально-экономическое, культурное развитие агрогородка, за конкретные высокие достижения в профессиональной, общественной и благотворительной деятельности. В исключительных случаях звание «Почётный гражданин аг. Повитье Кобринского района» может присваиваться по иным основаниям.

2. Ходатайство о присвоении звания «Почётный гражданин аг. Повитье Кобринского района» представляется сельским исполнительным комитетом, трудовыми коллективами, расположенными на территории агрогородка. Ходатайство о представлении кандидата на присвоение звания «Почётный гражданин аг. Повитье Кобринского района должно содержать биографические сведения на кандидата и описание его конкретных достижений и заслуг.

Звание «Почетный гражданин аг. Повитье Кобринского района» присваивается решением Повитьевского сельского исполнительного комитета.

Информация о принятом решении вывешивается на стенде сельисполкома.

3. Лицам, удостоенным звания «Почётный гражданин аг. Повитье Кобринского района» и вручается свидетельство о присвоении звания «Почётный гражданин аг. Повитье».

4. Почётные граждане агрогородка приглашаются для участия в торжественных мероприятиях, проводимых в агрогородке.

ПОВИТЬЕВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

31 октября 2014 г. № 115

аг. Повитье

**Об учреждении звания «Почётный гражданин аг. Повитье «Кобринского района» и утверждении Положения о порядке присвоения звания «Почётный гражданин аг. Повитье Кобринского района»**

В соответствии с Законом Республики Беларусь от 4 января 2010 года «О местном управлении и самоуправлении в Республике Беларусь» Повитьевский сельский исполнительный комитет РЕШИЛ:

1. Об учреждении звания «Почётный гражданин аг. Повитье Кобринского района».

2. Утвердить прилагаемые:

2.1.Положение о порядке присвоения звания «Почётный гражданин аг. Повитье Кобринского района».

2.2. образец свидетельства «Почётный гражданин аг. Повитье Кобринского района».

Председатель Н. М. Сухаревич

Управляющий делами С. И. Милошевская

*Даведка*

# Званне «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна»

**прысвойваецца Павіццеўскім сельскім выканаўчым камітэтам за значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае, культурнае развіццё аграгарадка, за пэўныя высокія дасягненні ў прафесійнай, грамадскай і дабрачыннай дзейнасці.**

**Званне «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна» прысвойваецца жыхарам і асобам, якія пражываюць па-за яго межамі, за адмысловыя заслугі перад аграгарадком.**

# БРЫШЦЕН
# МІКАЛАЙ РЫГОРАВІЧ

**БРЫШЦЕН Мікалай Рыгоравіч** нарадзіўся 2 лютага 1950 года ў вёсцы Павіцце Кобрынскага раёна. З малых гадоў пачаў маляваць.



Пасля заканчэння школы Мікалай працаваў у кобрынскім кінатэатры - маляваў афішы да фільмаў, у бытпрамкамбінаце. У 1968-1970 гадах служыў у Савецкай Арміі ў танкавых войсках.

З 1970 па 1975 год працаваў у Дзівінскай сярэдняй школе настаўнікам выяўленчага мастацтва. У 1975-1980 гадах - у Павіццеўскім лясніцтве на пасадзе «мастак-афарміцель».

1981-1984 - гады завочнай вучобы ў Пружанскім тэхнікуме, факультэт «механізацыя сельскай гаспадаркі». Адзінаццаць гадоў працаваў механікам у Днепрабугскай гаспадарцы.

З 2000 года да пенсіі Мікалай Рыгоравіч настаўнік працоўнага навучання ў Павіццеўскай сярэдняй школе, вёў розныя гурткі. І сёння ў школе ёсць цэлая галерэя работ мастака, якія ён пакінуў школе.

У 2017 годзе за выдатную працу, адказныя адносіны да працы, асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё аграгарадка Павіцце Брышцен Мікалай Рыгоравіч удастоены звання «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна» (рашэнне Павіццеўскага сельвыканкама ад 28.09.2017 г., № 68).

**Кузьмич, Н**. Надо работать, а не ждать, когда придет вдохновение / Николай Кузьмич // Заря.- 2009. - 3 декабря. - С. 18-19.

**Кузьміч, М.** Каб шчасце прыйшло як заслуга / М. Кузьміч, гутарыла Алена Капачова // ЛіМ. – 2008. – 3 мая. - С. 10.

**М. Кузьміч**. «Мець чыстую душу і маліцца свайму богу…» / Мікалай Кузьміч // Мастацтва. - 2008. - № 6. - С. 39-41.

**Капачова, А**. Мікалай Кузьміч / А. Капачова // Народная трыбуна. - 2007. - 8 верасня. - С. 4.

**Ломсадзе, Л**. Все остается людям / Лилия Ломсадзе // Беларуская думка. - 2007. - № 2. - С. 98-104.

**Матвеев, В**. Усыпальница для Евфросиньи / Василий Матвеев // Рэспубліка. - 2007. - 24 мая.- С. 3.

**Награда** за святое дело // Заря. - 2007. - 9 июня. - С. 2.

Художник Н. Кузьмич получил орден Преподобной Евфросинии Полоцкой.

**Пашкоўская, Л**. Саркафаг для Еўфрасінні / Людміла Пашкоўская // Мастацтва. - 2007. - № 11. – С. 10-11.

**Ролич, О**. Рака для преподобной Евфросинии Полоцкой / Ольга Ролич // Заря.- 2007. - 5 апреля. - С. 7.

**Хокимова, А**. Молитва к небесной заступнице / Антонина Хокимова // Вечерний Брест. - 2007. - 6 апреля. – С. 4.

**Дзюрич, Э.** Рака для Преподобной / Эма Дзюрич // Брестские епархиальные ведомости. – 2006. - № 1. - С. 43-45.

**Дзюрич, Э.** «Не поднимаешься - значит, падаешь», - уверен Н. Кузьмич, воссоздавший Крест Евфросинии Полоцкой / Э. Дзюрич. - Заря.- 2006. - 28 января. – С. 8.

**Марчук, Н**. Узнаўленне ракі Прападобнай Еўфрасінні / Ніна Марчук // Белорусская нива. - 2006. - 6 января.- С. 6.

Аб творчасці мастака М. Кузьміча.

**Пракаповіч, М**. І паўсталі рагвалодавы нашчадкі / Мікола Пракаповіч // Вечерний Брест. - 2006. - 17 ноября. - С. 7.

**Русак, Н**. Каўчэг Еўфрасінні / Н. Русак // Народная трыбуна. - 2006. - 6 студзеня. – С. 3.

# КУРАШЫК
# ВІТАЛІЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ

**КУРАШЫК Віталій Уладзіміравіч** - Ганаровы грамадзянін горада **Еўпаторыі** (Крым).



Віталій Курашык нарадзіўся 8 мая 1939 года ў вёсцы Дзівін Кобрынскага павета Палескага ваяводства (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці) у сялянскай сям’і.

У Дзівінскую сярэднюю школу пайшоў у шэсць гадоў у далёкім пасляваенным 1945 годзе. У школьныя гады захапляўся спортам, меў спартыўныя дасягненні, пісаў вершы.

Пасля заканчэння Дзівінскай сярэдняй школы ў 1955 годзе паехаў вучыцца і працаваць на Данбас (Украінская ССР). У 1957 годзе закончыў тэхнічнае вучылішча ў Луганскай вобласці. Пасля заканчэння ў 1960 годзе Тарэзскага горнага тэхнікума (Данецкая вобласць) працаваў машыністам электравоза, горным майстрам самай глыбокай шахты Данбаса «Качагарка» (г. Горлаўка), тэхнолагам, галоўным тэхнолагам завода высакавольтнай апаратуры ў г. Канстанцінаўка. Шэсць гадоў аддаў шахцёрскай працы. Узнагароджаны ордэнамі Шахцёрскай Славы II і III ступеняў.

Закончыў завочна Украінскі політэхнічны інстытут (1967). Пасля знаходзіўся на партыйнай і савецкай рабоце. У 1974-1982 гадах - другі, першы сакратар Канстанцінаўскага гаркама кампартыі Украіны.

З 1982 года Віталій Курашык жыве ў Крыме, які стаў яго другой радзімай. У 1982–1985 гадах быў старшынёй Еўпатарыйскага гарвыканкама. З прыходам В. У. Курашыка на пасаду старшыні ў Еўпаторыі была створана служба «05» для «сувязі ўлады з народам», з’явіліся мноства жылых дамоў, новая набярэжная, тэлефонная станцыя, новы будынак чыгуначнага вакзала, дарогі, інжынерныя сеткі, рэалізаваны вялікі праект па пасадцы дрэваў (тысячы іх і па гэты час упрыгожваюць горад).

У 1985-1987 гадах В. У. Курашык - загадчык аддзела Крымскага абкама КПУ, у 1987-1991 гадах - намеснік старшыні, першы намеснік старшыні, старшыня выканкама Крымскага абласнога Савета народных дэпутатаў. Пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (1986) займаўся эвакуацыяй пацярпелага насельніцтва бліжэйшых вёсак у Крымскую вобласць. Народны дэпутат Вярхоўнага Савета УССР і Вярхоўнай Рады Украіны ў 1990–1994 гадах. У 1991–1993 гадах – старшыня (прэм’ер-міністр) Савета Міністраў Аўтаномнай Рэспублікі Крым, якая была ўтворана ў 1991 годзе. Дэпутат Вярхоўнай Рады Рэспублікі Крым I склікання (1991–1994). Актыўна ўдзельнічаў у рабоце Усеўкраінскага саюза беларусаў.

На пасольскую працу сышоў з пасады старшыні Савета Міністраў Крыма. З 20 мая 1993 года па 14 чэрвеня 2001 года - Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь ва Украіне. Дарэчы, ён першы прадстаўляў нашу суверэнную незалежную Беларусь ва Украіне ў рангу Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла. І гэта, як успамінае

Віталій Уладзіміравіч, быў самы важны і цікавы перыяд яго жыцця. Дзякуючы рабоце пасольства, пашыраліся эканамічныя сувязі на розных узроўнях, аказвалася падтрымка прадстаўнікам дыяспар, арганізоўваліся навуковыя форумы і ўрачыстыя мерапрыемствы, што садзейнічала развіццю гуманітарных кантактаў. У 1999–2001 гадах В. У. Курашык быў дуайенам дыпламатычнага корпусу ва Украіне.

З 2001 года ён - першы віцэ-прэзідэнт Міжрэгіянальнай Акадэміі кіравання персаналам. Віталій Уладзіміравіч з'яўляецца Акадэмікам Беларускай інжынернай акадэміі, Ганаровым доктарам Міжнароднай кадравай акадэміі. Узнагароджаны залатым медалём Міжнароднай кадравай акадэміі «За эфектыўнае кіраванне». З 2003 года - саветнік Прадстаўніка Прэзідэнта ААТ «Лукойл» ва Украіне.

За сваю палітычную і грамадскую дзейнасць у Беларусі і Украіне В. У. Курашык узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і «За заслугі» III і II ступеняў (Украіна), а таксама Ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Кабінета Міністраў Украіны і іншымі ўзнагародамі. Народны дэпутат Украіны ў 1990-1994 гадах. Дэпутат Вярхоўнай Рады Крыму I склікання (1991-1994).

6 мая 1999 года за вялікі асабісты ўклад у развіццё Еўпаторыі і шматгадовую актыўную дзейнасць на карысць жыхароў горада Віталію Уладзіміравічу Курашыку прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Еўпаторыі».

В. У. Курашык цяпер жыве ў Еўпаторыі, піша кнігі, у якіх дзеліцца ўспамінамі: «Уроки жизни» (2006), «Живи и помни» (2008), «Я люблю тебя, жизнь!» (2014), «Моя жизнь» (2015), «Вспоминая прошлое, думаю о будущем» (2016). Усё жыццё захапляўся фатаграфіяй, таму кнігі добра ілюстраваны. Некаторыя яго кнігі двойчы перавыдаваліся. Шмат экзэмпляраў падарыў бібліятэкам, сябрам, выслаў у розныя краіны, дзе ёсць яго сябры (Беларусь, Расія, Куба, Літва, ЗША, Італія і інш.). У 2002 годзе выйшла кніга «Я не хочу судьбу иную…», у якой аўтар шмат старонак прысвяціў сваёй малой радзіме – вёсцы Дзівін.

У 2015 годзе В. У. Курашык перадаў свой асабісты архіў на пастаяннае захоўванне ў Дзяржаўны архіў Рэспублікі Крым.

Віталій Курашык, беларускі хлопец з палескай глыбінкі, прайшоў шлях ад шахцёра да старшыні Саўміна Крыма, вядомага дыпламата. У адной з яго кніг знаходзім такое яго жыццёвае крэда: «Працаваць да сёмага поту… Любіць жыццё. Берагчы блізкіх людзей. Быць карысным для іншых і шчодрым, заўсёды гатовым прыйсці на дапамогу людзям».

### *Творы*

**Курашик, В. В.** Я не хочу судьбу иную… / В. В. Курашик. – К. : МАУП, 2002. – 352 с.

Отрывок из книги В. В. Курашика, уроженца д. Дивин.

**Курашик, В. В**. Я люблю тебя, жизнь : [биографический очерк] / В. В. Курашик. – Симферополь : Антиква, 2014. – 160 с. ; [18] л. ил.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Гапанович, А. Н.** Виталий Владимирович Курашик / Афанасий Гапанович // Дивин - древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. - С. 72, 73. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Курашик Виталий Владимирович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т.
Т. 1. Брестская область: в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 517.

**Курашик, В.** Пути-перепутья / [Виталий Курашик ; беседовал М. Н. Шиманский] // Моя вера - моя Беларусь / М. Н. Шиманский. – Минск, 2010. – С. 142-153.

**Курашык Віталь Уладзіміравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 437 : фота. – (Імі ганарацца землякі).

**Курашык Віталій Уладзіміравіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі : інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 67-69.

**Курашык Віталій Уладзіміравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 83-85.

**Курашык Віталь Уладзіміравіч** // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 23.

**Шпакова, Н. В**. Курашик Віталій / Н. В. Шпакова // Українська дипломатична енциклопедія : у 2-х т. – Киев : Знання України, 2000. - Т. 1.

**Юрчак, Д. В**. Виталий Владимирович Курашик - первый посол Республики Беларусь в Украине: страницы биографии и дипломатическая деятельность / Д. В. Юрчак // Ученые записки УО «ВГУ им. П. М. Машерова» : сборник научных трудов. - Витебск, 2016. – Т. 22. - С. 76-81. - Библиография : с. 81 (10 назв.).

**80 гадоў** з дня нараджэння В. У. Курашыка // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 102-103.

**Ждановіч, І.** Будзе цёпла ізноў... / Іван Ждановіч // Советская Белоруссия. - 2015. – 26 марта.

В. Курашык падараваў землякам-беларусам сваю новую кнігу.

**Курашик, В.** Я… посол. Что я могу? / В. Курашик // Рэспубліка. – 1994. – 16 чэрвеня. – С. 5.

**Персоналии. Курашик** Виталий Владимирович [Электронный ресурс] // Крым политический. – Режим доступа: http://politika-crimea.ru/persons/441-kurashik-vitalij-vladimirovich. – Дата доступа: 03.04.2019.

**Почётные** граждане города Евпатории. **Курашик Виталий Владимирович** [Электронный ресурс] // Официальный сайт муниципального образования городской округ Евпатория Республики Крым. – Режим доступа: http://my-evp.ru/imi-gorditsya-gorod/spisok-pochetnyx-grazhdan-goroda/. – Дата доступа: 11.04.2019.

# МЕЯРЭВІЧ КАНСТАНЦІН МІКАЛАЕВІЧ

**МЕЯРЭВІЧ Канстанцін Мікалаевіч** (1936–2018) - Ганаровы грамадзянін горада **Разані** (Расійская Федэрацыя). Акадэмік Міжнароднай акадэміі арганізацыі вытворчасці, член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі менеджменту, заслужаны будаўнік Расійскай Федэрацыі.



Нарадзіўся Канстанцін Меярэвіч 26 студзеня 1936 года ў горадзе Кобрыне. Выпускнік сярэдняй школы № 2 Кобрына. Вучыўся ён выдатна і ў 16 гадоў закончыў школу з медалём.

У 1952 годзе К. Меярэвіч паступіў у Кіеўскі політэхнічны інстытут. У 1957 годзе закончыў інстытут, тады ж пачаўся яго працоўны шлях у будаўнічай галіне. На Краснадарскім камбінаце будаўнічых матэрыялаў Канстанцін Мікалаевіч працаваў зменным і старшым майстрам, начальнікам кардоннага цэху. З 1966 па 1970 год узначальваў партыйную арганізацыю прадпрыемства. У 1970-1971 гадах - намеснік галоўнага інжынера камбіната.

Адукацыю Канстанцін Меярэвіч працягнуў у Ленінградскім інжынерна-эканамічным інстытуце, па заканчэнні якога ў 1971 годзе пераехаў у Разань. Тут яго чакала цікавая праца ў галіновай праектна-канструктарскай арганізацыі. Працаваў начальнікам Разанскага вытворча-тэхнічнага аб'яднання «Оргкровля» Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў (МПБМ) РСФСР. У 1977 годзе быў прызначаны дырэктарам Разанскага кардонна-руберойднага завода, з 1992 года Канстанцін Мікалаевіч - генеральны дырэктар ЗАТ «Разанскі КРЗ».

Больш 35 гадоў К. М. Меярэвіч кіраваў самым буйным у Расіі і СНД заводам па вытворчасці мяккіх дахавых матэрыялаў. Прадпрыемства пад яго кіраўніцтвам стала перадавым, многія гады ўваходзіць у эліту будаўнічага комплексу не толькі рэгіёна, але і Расіі, станавілася лаўрэатам конкурсу «100 лепшых тавараў Расіі», пераможцам Усерасійскага конкурсу «Лепшыя расійскія прадпрыемствы» за найвышэйшую эфектыўнасць выкарыстання ўсіх відаў рэсурсаў сярод прамысловых прадпрыемстваў краіны.

Указам Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ў ліпені 1994 года Меярэвічу прысвоена званне «Заслужаны будаўнік Расійскай Федэрацыі». Канстанцін Мікалаевіч - лаўрэат нацыянальнай прэміі імя Пятра Вялікага ў намінацыі «За значны ўклад у стварэнне новых відаў канкурэнтаздольнай прадукцыі», лаўрэат конкурсу «СНД - дырэктар года 1999», пераможца Усерасійскага конкурсу «Менеджэр года» ў намінацыі «Вытворчасць будаўнічых матэрыялаў» (1999), уладальнік сертыфіката «Лепшы кіраўнік арганізацыі будаўнічага комплексу» (2007).

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, Залатым медалём імя акадэміка У. Ф. Уткіна, залатым медалём «Дырэктар года - 2001», медалямі «За дабрачыннасць», «За дабрыню і шчодрасць» абласнога фонду ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл, ганаровым знакам Расійскага саюза прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў «За вялікі ўклад у развіццё

айчыннай прамысловасці і прадпрымальніцтва, стварэнне асноў рыначнай эканомікі», ганаровымі граматамі федэральнага і рэгіянальнага ўзроўню.

Пастановай мэра г. Разані ў красавіку 1996 года Меярэвічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Разані».

Яго радзіма - Беларусь, месца вучобы – Украіна, месца жыхарства – Расія. Свае родныя мясціны ў Беларусі К. М. Меярэвіч не забываў ніколі, наведваў рэгулярна. З землякамі чэрпаў сілы для жыцця і далейшай працы. З землякамі ён чэрпаў сілы для жыцця і далейшай працы.

Памёр Канстанцін Мікалаевіч 26 снежня 2018 года.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Меерович Константин Николаевич** // Почетные граждане Рязанской области и города Рязани : биобиблиографический указатель / РОУНБ им. Горького. - Рязань, 2009.

**Меярэвіч Канстанцін Мікалаевіч** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 140-141 : фат.

**Меярэвіч Канстанцін Мікалаевіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі : інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 69-71.

**Меярэвіч Канстанцін Мікалаевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2017. - С. 97-98.

**80 гадоў** з дня нараджэння К. М. Меярэвіча // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 13.

**Лидер** // Рязанские ведомости. – 2020. – 22 января.

О профессиональной деятельности и судьбе заслуженного строителя РФ, почетного гражданина г. Рязани К. Н. Меоревича, в течение 40 лет возглавлявшего Рязанский картонно-рубироидный завод.

**[Меерович Констанин Николаевич]** : некролог // Рязанские ведомости – 2018. – 28 декабря (№ 195). – С. 20.

**Шеламова, Т.** Свежий глаз / Татьяна Шеламова // Вечерний Брест. – 2013. – 25 июня.

Генеральный директор ЗАО «Рязанский картонно-рубероидный завод», председатель городской общественной организации «Рязанское землячество белорусов», почетный гражданин Рязани, уроженец Брестской области К. Меерович в составе делегации посетил Брестчину.

**Говоров, А.** Успешный Меерович / Анатолий Говоров // Рязанские ведомости. – 2011. - 27 января.

**Если быть**, то быть лучшим! // Кобрин-информ. - 2009. - 17 сентября. - С. 27.

Директор Рязанского картонно-рубероидного завода К. Н. Мееревич, уроженец Кобрина.

**Меревич Константин Николаевич** // Администрация города Рязани : официальный сайт. – Режим доступа: http://admrzn.ru/gorod-ryazan/pochetnye-grazhdane/:5831. – Дата доступа: 2.102017.

**Рязань** простилась с Заслуженным строителем РФ Константином Меревичем [Электронный ресурс] // Рязанская городская Дума. – Режим доступа: http://rgdrzn.ru/news/detal/4749. – Дата доступа: 28.05.2020.

**Меревич Константин Николаевич** // «Лучшие люди» : международная энциклопедия. – Режим доступа: http://bestpeople.name/ book/face/url/ MJEJERJEVICH_ KONSTANTIN_NIKOLAJEVICH/. – Дата доступа: 2.10.2017.

**Говоров, А.** Генеральный директор / Анатолий Говоров, Валентина Севостьянова // МедиаРязань. – Режим доступа:http://mediaryazan. ru/articles /detail/328817.html. – Дата доступа: 2.10.2017.

**Выпускники.** Ими гордится школа. **Меревич Константин Николаевич** // ГУО «Средняя школа № 2 г. Кобрина». - Режим доступа: http://sch2.kobrin.edu.by/ ru/main.aspx?guid=1391. – Дата доступа: 2.10 2017.

**Памяти** Меревича Константина Николаевича [Электронный ресурс] // Многоотраслевая производственная компания «КРЗ». – Режим доступа: https://krz.ru/kompani/o-kompanii.html. – Дата доступа: 28.05.2020.

# РАМАНЮК
# ІВАН ЛЯВОНЦЬЕВІЧ

**РАМАНЮК Іван Лявонцьевіч** (1907–1979) - Ганаровы грамадзянін горада **Лунінца** (Брэсцкая вобласць, Рэспубліка Беларусь).



Нарадзіўся ў 1907 годзе ў вёсцы Осаўцы Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці).

З 1916 да 1924 года быў парабкам. З 1925 па 1929 год - рабочы рыбнай гаспадаркі. З 1932 года - старшыня сельсавета.

У гады Вялікай Айчыннай вайны І. Л. Раманюк прайшоў шлях ад радавога партызана да камісара партызанскага атрада імя Калініна брыгады імя Кірава Пінскага злучэння. З мая 1943 па ліпень 1944 года знаходзіўся на адказнай савецкай рабоце. З 1950 па 1954 год - старшыня калгаса. З 1958 года - персанальны пенсіянер.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і «Знак Пашаны», медалём «Партызану Айчыннай вайны» І ступені.

Званне «Ганаровы грамадзянін горада Лунінца» І. Л. Раманюк удастоены ў 1974 годзе.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Долготович, Б. Д.** Романюк Иван Леонтьевич / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 38-39.

[**Раманюк Іван Лявонцьевіч**] // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Лунінецкага раёна. – Мінск, 1995. - С. 347, 348,354, 391,392.

**Раманюк Іван Лявонцьевіч** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 71: фат.

**Раманюк Іван Лявонцьевіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 71-72.

# РАТАЙКА ПЁТР ІВАНАВІЧ

**РАТАЙКА Пётр Іванавіч** (1898–1982) - Ганаровы грамадзянін горада **Гродна** (Рэспубліка Беларусь). Савецкі дзяржаўны дзеяч, першы старшыня Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў (1939-1941), ветэран Вялікай Айчыннай вайны.



Нарадзіўся 13 студзеня 1898 года ў вёсцы Пескі Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці) у сялянскай сям'і.

У 1912 годзе закончыў мясцовую трохкласную школу, з 14 гадоў пачаў працаваць. У верасні 1915 года сям'я эвакуіравалася ў Арэнбург, там Пётр працаваў на Арэнбургска-Орскай чыгунцы.

У маі 1916 года васемнаццацігадовым юнаком трапіў на фронт (Першая сусветная вайна). Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю сустрэў у складзе 18-га стралковага палка ў званні радавога, а потым палітрука (камісара). Ваяваў у Грамадзянскую вайну, удзельнічаў у баях з войскамі генерала Дутава і арміяй Калчака. У ліпені 1920 года ўступіў у Расійскую камуністычную партыю бальшавікоў.

Пасля дэмабілізацыі - у Беларусі. Працаваў старшынёй Заслаўскага і Самахвалавіцкага валасных выканкамаў (1921-1939). Вучыўся ў Мінскім камуністычным універсітэце імя У. І. Леніна (1926-1929). Пасля яго заканчэння працаваў старшынёй Чэрыкаўскага, потым Крычаўскага райвыканкамаў, намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама да 1939 года.

У 1939-1941 гадах - старшыня Гродзенскага гарвыканкама. Ён першы старшыня Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў (са снежня 1939 па чэрвень 1941 года). Шмат карысных спраў удалося зрабіць у горадзе старшыні за няпоўныя два гады савецкай улады.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Ратайка знаходзіўся ў дзеючай арміі. Ваяваў у складзе 3-й арміі на Бранскім фронце. За мужнасць у барацьбе з ворагам ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Восенню 1943 года з пачаткам вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Пётр Іванавіч быў адкліканы з арміі і накіраваны ў распараджэнне Савета Народных Камісараў (СНК) БССР, які часова знаходзіўся ў Гомелі. Працаваў намеснікам старшыні Савета народных камісараў БССР (1943-1944).

У 1944 годзе прыехаў у Гродна. Да 1948 года займаў пасаду старшыні Гродзенскага абласнога выканкама. У гэтыя гады шмат увагі і часу аддаваў аднаўленню разбуранай гаспадарцы горада.

У наступныя гады Пётр Іванавіч працаваў у Мінску. На працягу некалькіх гадоў узначальваў Галоўнае ўпраўленне рыбнай прамысловасці пры Савеце Міністраў БССР (1948-1953).

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР I, II, III скліканняў (1938-1955).

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Чырвонага Сцяга, медалямі.

6 снежня 1967 года Пётр Іванавіч Ратайка рашэннем выканаўчага камітэта Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных № 260 удастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Гродна».

Пастановай ад 31 ліпеня 1968 года № 149 выканкама Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных і бюро Гродзенскага гаркама КПБ першы старшыня Гродзенскага гарвыканкама (1940-1941), старшыня Гродзенскага аблвыканкама (1944-1948) Ратайка Пётр Іванавіч занесены ў Кнігу народнай славы горада Гродна.

**Ратайко, П. И.** На жизненных кручах : документальная повесть / Пётр Ратайко ; [литературная запись В. Дубинки]. – Минск : Юнацтва, 1985. - 239 с.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Ганаровыя** грамадзяне горада Гродна ў пасляваенны перыяд. **Ратайка Пётр Іванавіч** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка горада Гродна. – Мінск, 1999. – С. 683. – (З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны).

**Госцеў, А. П.** [Ратайко Пётр Иванович] / А. П. Госцеў, В. В. Швед // Кронан. Летапіс горада на Немане (1116-1990 гг.) / А. П. Госцеў, В. В. Швед. - Гродна, 1993. – С. 203.

**Долготович, Б. Д.** Романюк Иван Леонтьевич / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 204-205.

**Плешавеня, А. М**. Першы старшыня / А. М. Плешавеня // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка горада Гродна. – Мінск, 1999. – С. 330, 331. – (На крутым павароце гісторыі).

**Ратайка Пётр Іванавіч** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1972. – Т. 9. – С. 132.

**Ратайко Пётр Иванович** // Гродно : энциклопедический справочник. - Минск, 1989. - С. 343.

**Ратайко Пётр Иванович** // Книга народной славы. 1917-1967 : 50 год [Октябрьской революции]. - Гродно, 1968. - [С. 16.] ; Место хран. : УК Гродненский государственный историкоархеологический музей.

**Ратайка Пётр Іванавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 72-73.

**Жебрун, Е.** Председатели Гродненского облисполкома [в т. ч. П. И. Ратайко] [Электронный ресурс] / Евгений Жебрун // Проза.ру. - Режим доступа: https:// www.proza.ru/2015/08/03/269. - Дата доступа: 01.03.2018.

**Почётные граждане. Ратайко Пётр Иванович** [Электронный ресурс] // Гродненский городской исполнительный комитет : официальный Интернет-портал. - Режим доступа: http://grodno.gov.by/ru/main.aspx?guid=2071 - Дата доступа: 01.03.2018.

**Ратайко Пётр Иванович** [Электронный ресурс] // Книга славы г. Гродно. – Режим доступа: http://persony. grodno.by/ glory/? page=people&item=77. – Дата доступа: 28.02.2018.

# СЕЛІВОНІК ВАСІЛІСА СЯМЁНАЎНА

**СЕЛІВОНІК Васіліса Сямёнаўна** (1907–1990) - Ганаровы грамадзянін



горада **Брэста** (Рэспубліка Беларусь). Дзеяч рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, удзельніца партызанскай барацьбы ў гады Вялікай Айчыннай вайны

Васіліса Селівонік (у дзявоцтве Козел) нарадзілася 28 кастрычніка 1907 года ў вёсцы Літвінкі Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці) у сялянскай сям’і.

У 1915 годзе ў сувязі з надыходзячым фронтам Першай сусветнай вайны сям’я з’ехала ў Калужскую губерню, апынулася ў сяле Калодзезі Казельскага павета. Там у 1919 годзе Васіліса закончыла 4 класы царкоўна-прыходскай школы. Бацька, Сямён Кліменцьевіч Козел, ваяваў на франтах Першай сусветнай, а потым Грамадзянскай войнаў.

У 1921 годзе сям'я вярнулася на радзіму. Родная хата згарэла, паступова пачалі падымаць гаспадарку. Чатырнаццацігадовай Васілісе давялося пайсці ў служанкі, дзе яна была тры гады, потым працавала ў сельскай гаспадарцы па найму.

На радзіме, якая аказалася пад уладай Польшчы, Васіліса не магла мірыцца з прыгнётам, які чынілі новыя ўлады, таму 20-гадовай дзяўчынай свядома ў 1928 годзе ўступіла ў падпольную арганізацыю Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ), а з 1931 года стала членам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ).

Знаходзячыся на партыйнай рабоце, Васіліса Селівонік займала шэраг адказных пасад. У ліпені 1931 года яна выбрана намеснікам сакратара Кобрынскага падпольнага райкама КПЗБ. У 1933-1934 гадах В. Селівонік вучылася ў Мінскай школе КПЗБ, пасля заканчэння якой працавала сакратаром Гродзенскага, Слонімскага, Пінскага акруговых камітэтаў КПЗБ.

У 1935 годзе В. Селівонік - дэлегат II з'езду КПЗБ.

Васілісу Селівонік вузкі круг ведаў па партыйных псеўданімах «Галя», «Ліза», «Сашка». За рэвалюцыйную дзейнасць 1 красавіка 1936 года яна была арыштавана польскімі ўладамі ў Пінску. У лютым 1937 года прыгаворана да дзесяці гадоў турэмнага зняволення. Была змешчана ў турму г. Седльцы, затым пераведзена ў жаночую катаржную турму «Фордан», далёка ад роднага краю. Вызвалена Чырвонай арміяй у верасні 1939 года.

В. С. Селівонік была дэпутатам Народнага сходу Заходняй Беларусі ад Кобрынскага раёна, дзе прагаласавала за ўз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР. У 1940 годзе пераехала на працу ў Жабінку, была загадчыцай аддзелам кадраў Жабінкаўскага райвыканкама.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Васіліса Селівонік з'яўлялася сувязной партызанскага атрада імя М. М. Чэрнака, затым ваявала ў складзе атрада. З красавіка 1943 года В. Селівонік - сакратар Жабінкаўскага раённага антыфашысцкага камітэта.

Пасля вайны В. С. Селівонік на партыйнай і савецкай рабоце ў г. Брэсце. Працавала інструктарам аблвыканкама, загадчыцай агульным аддзелам гарвыканкама, восем год займалася выхаваннем моладзі ў рамесленым вучылішчы.

Пасля выхаду на пенсію Васіліса Сямёнаўна актыўна займалася грамадскай працай у складзе ветэранскіх арганізацый. Яна з’яўляецца аўтарам успамінаў, якія змешчаны ў зборніках «У суровыя гады падполля» (1958), «Годы испытаний и мужества» (1973).

Узнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі і многімі медалямі.

16 мая 1969 года В. С. Селівонік было прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Брэста». Яна была ўшанавана 24 мая на ўрачыстым сходзе грамадскасці, прысвечаным 950-годдзю Брэста.

Васіліса Сямёнаўна Селівонік памерла 14 снежня 1990 года, пахавана на гарадскіх могілках Брэста. На доме, у якім яна жыла (вул. Інтэрнацыянальная, 7), усталявана мемарыяльная дошка.

### *Працы, успаміны*

**Селивоник, В. С.** Нас сроднило суровое время / В. С. Селивоник // В едином строю: воспоминания участников партизанского движения в Белоруссии, 1941–1944. - Минск, 1970. - С. 53–63.

**Селівонік, В.** Рэвалюцыйныя выступлені ў Кобрынскім павеце / Васіліса Селівонік // У суровыя гады падполля : успаміны былых членаў КПЗБ – актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. - Мінск, 1958. - С. 176–178.

**Селивоник, В. С**. Странички биографии / В. С. Селивоник // Годы испытаний и мужества. - Минск, 1973. - С. 179–188.

**Слова** пра баявых сяброў : з успамінаў В. С. Селівонік // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 228-230.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Боровский, А.** О них молчали сводки / А. Боровский. – Минск : Беларусь, 1970. – 112 с.: ил.

См. на с. 90–94.

**В борьбе** и труде: участие женщин Белоруссии в революционном движении, социалистическом и коммунистическом строительстве : сборник. – 3-е изд., перераб. и доп. – Минск : Беларусь, 1985. – С. 189.

**Василиса** Семеновна и Женя // Памяць. Жабінкаўскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 1999. - С. 248–251.

**Васіліса Селівонік** // Памяць. Брэсцкі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 1998. - С. 237.

**Долготович, Б. Д.** Селивоник Василиса Семёновна / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. - С. 13.

**Клімец, М. І.** Селівонік Васіліса Сямёнаўна / М. І. Клімец // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 2002. - Т. 14. - С. 307.

**Клімец, М.** Селівонік Васіліса Сямёнаўна / Міхаіл Клімец // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 2001. - Т. 6, кн. 1. - С. 276.

**Науменко, В. Я.** [Селивоник Василиса Семёновна] / В. Я. Науменко // Брест : историко-экономический очерк / В. Я. Науменко. – Минск, 1977. – С. 144.

**Орехво, Н**. С. Дела и люди КПЗБ : воспоминания / Н. С. Орехво. – Минск : Беларусь, 1983. – 287 с.

См. на с. 192,196,283.

**Ромма, Ф.** Мужала молодость в боях : Записки секретаря подпольного обкома комсомола / Ф. Ромма. – Минск : Беларусь, 1974. – 312 с.: ил.

См. на с. 235–239.

**Почётные** граждане Бреста. **Селивоник Василиса Семёновна** // Брест. Брэст. Brest. 1000 / сост. А. Н. Вабищевич. – Минск, 2019. – С. 78.

**Селивоник Василиса Семёновна** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 340-341.

**Селивоник Василиса Семёновна** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. - Минск, 2008. - Т. 6. - С. 617.

**Селивоник Василиса Семёновна** // Брест : энциклопедический справочник. – Минск, 1987. – С. 326.

**Селівонік Васіліса Сямёнаўна** // Памяць. Брэст : гісторыка-дакументальная хроніка : у 2 кн. - Мінск, 2001. - Кн. 2. - С. 643–645.

**Селівонік Васіліса Сямёнаўна** : [біяграфічная даведка] // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 228. – (Слова пра баявых сяброў).

**Селивоник Василиса Семеновна** // Ими гордится Брест : библиографический указатель литературы (по материалам краеведческих пресс-досье) / Брестская городская централизованная библиотечная система, центральная городская библиотека им. А. С. Пушкина, информационно-библиографический отдел ; сост.: Юркевич Ж. В., Артёмчик Н. В. – Брест, 2012. – С. 36-37.

**110 гадоў** з дня нараджэння Васілісы Сямёнаўны Селівонік // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 46.

**Бензярук, А.** У тыя векапомныя дні / Анатоль Бензярук // Сельская праўда. – 2018. – 26 чэрвеня.

Адной з найбольш актыўных удзельніц антыфашысцкага руху стала Васіліса Сямёнаўна Селівонік, ганаровы грамадзянін горада Брэста.

**Литвинович, Е.** Быть в почёте / Евгений Литвинович // Заря. - 2014. - 20 мая. - С. 3.

В 1969 г. звание «Почётный гражданин города Бреста» было присвоено сразу трём известным людям, среди которых В. С. Селивоник, уроженка д. Литвинки Кобринского района.

**Крэйдзіч, М.** Шляхам трывог і надзей / Марыя Крэйдзіч // Народная трыбуна. – 2009. – 14 сакавіка.

**Селивоник Василиса Семеновна** : [некролог] / Л. И. Плечко, И. Б. Венцель, Е. Н. Водчиц, Б. И. Гаврилов, М. М. Гладун [и др.] // Заря. – 1990. – 18 декабря. – С. 3.

**Алясюк, А.** Іх жыццё – легенда : [В. С. Селівонік] / А. Алясюк, І. М. Каржук // Сельская праўда. Жабінка. - 1985. - 8 сакавіка.

**Бяганская, Я.** Слова пра ветэрана : [В. С. Селівонік] / Я. Бяганская // Чырвоная змена. - 1984. - 10 студзеня.

**Алясюк, А.** У полымі вайны / А. Алясюк, І. М. Каржук // Сельская праўда. Жабінка. – 1983. – 22 сакавіка.

**Доброхотова, Е.** Депутат народного собрания / Е. Доброхотова // Заря. - 1982. - 17 ноября.

**Припотнев, А.** «Остаюсь в строю...» / А. Припотнев // Заря. – 1977. – 28 октября.

Сегодня почетному гражданину Бреста В. С. Селивоник исполняется 70 лет.

**Гогалеў, А.** Перамога кавалася з першага дня / А. Гогалеў // Сельская праўда. Жабінка. - 1974. - 29 студзеня.

**Затульский, И.** Василиса – Васютка / И. Затульский // Заря. - 1970. - 8 марта.

**Торжественное** заседание, посвященное 950-летию Бреста // Заря. - 1969. - 27 мая.

В программе чествование Почётных граждан города - В. С. Селивоник.

**Несколько** лет назад… : рассказ участницы первомайских маевок при панской Польше Василисы Семеновны Селивоник : [Кобрин в 1925 и 1931 гг.] // Заря. - 1949. - 1 мая.

**110 гадоў** з дня нараджэння Васілісы Сямёнаўны Селівонік : [Электронны рэсурс] // Краязнаўства Берасцейшчыны. – Рэжым доступу: http://kb.brl.by/. – Дата доступу: 12.02.2018.

# ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК


| | |
|---|---|
| Алісіевіч Фёдар Максімавіч | 9 |
| Барысаў Дзмітрый Кузьміч | 10-11 |
| Барысюк Мікалай Андрэевіч | 76-77 |
| Брышцен Мікалай Рыгоравіч | 65 |
| Гольцман Андрэй Міхайлавіч | 39-40 |
| Заверజанец Мікалай Аляксандравіч | 66 |
| Канцэвіч Іван Уладзіміравіч | 67 |
| Каранчук Павел Рыгоравіч | 41-44 |
| Кенда Мікалай Аляксеевіч | 44-45 |
| Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч | 11-14 |
| Кірычук Сцяпан Міхайлавіч | 78-79 |
| Клачковіч Марыя Мікалаеўна | 46-48 |
| Крывецкі Мікалай Анатольевіч | 68-69 |
| Кузіч Уладзімір Рыгоравіч | 49-52 |
| Кузьміч Мікалай Пятровіч | 79-84 |
| Курашык Віталій Уладзіміравіч | 85-87 |
| Мароз Іван Паўлавіч | 53-54 |
| Мартынаў Аляксей Міхайлавіч | 15-22 |
| Меярэвіч Канстанцін Мікалаевіч | 88-90 |
| Мігіц Васілій Мікалаевіч | 69-70 |
| Мілаянін Іван Фёдаравіч | 23-24 |
| Падбярэзін Ільля Міхайлавіч | 24-25 |
| Папроцкі Пётр Сяргеевіч | 55-56 |
| Раманюк Іван Лявонцьевіч | 90-91 |
| Ратайка Пётр Иванавич | 91-93 |
| Сандалаў Леанід Міхайлавіч | 25-27 |
| Сашко Вячаслаў Васільевіч | 70-71 |
| Селівонік Васіліса Сямёнаўна | 93-96 |
| Сідарук Праскоўя Сямёнаўна | 28-29 |
| Сялюк Пётр Дзянісавіч | 30-32 |
| Сухараў Уладзімір Іванавіч | 56-57 |
| Цецярук Іван Мікалаевіч | 72 |
| Цюлін Уладзімір Георгіевіч | 73-74 |
| Чопік Ганна Васільеўна | 74 |
| Чырун Святлана Іосіфаўна | 58-60 |

# ГЕАГРАФІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК

**А**нжэра-Суджэнск Кемераўскай вобласці 10
Антопаль 28
Арэнбург (Расійская Федэрацыя) 91
Арэхаўскі (Кобрынскі раён) 69,73
Аўстрыя 12

**Б**айканур (Расійская Федэрацыя) 76,77
Баранавічы (Брэсцкая вобласць) 23,78
Барысава (Кобрынскі раён) 41
Бельск (Кобрынскі раён) 41,46
Берлін 23
Брэст 9,23,25,37,41,44,46,49,
68,70,73,79,80,81,93,94
Бяроза (Брэсцкая вобласць) 44

**В**асільеўка (Палтаўскай вобласці, Украіна) 23
Вільнюс 80
Віцебская вобласць 69
Вічуга Іванаўскай вобласці (Расія) 25
Вялікае Междулессе (Бярозаўскі раён) 44

**Г**арадзец (Кобрынскі раён) 73
Германія 80
Гомель 92
Горлаўка (Данецкая вобласць) 85
Гродна 58,69,91,92,94
Грушава (Кобрынскі раён) 55

**Д**анбас 23,86
Данецкая вобласць 85
Дзівін (Кобрынскі раён) 55,86
Драгічын (Брэсцкая вобласць) 68

**Е**ўпаторыя (Крым) 85,86

**Ж**абінка (Брэсцкая вобласць) 25,94

**З**аслаўе (Мінская вобласць) 91
ЗША 80

**І**ванава (Брэсцкая вобласць) 44,68
Іванава-Узнясенск (Расія) 25
Ілаўск (Кобрынскі раён) 28

**К**азахстан 67
Калодзезі (Казельскі павет Калужскай губерніі) 93
Камянец (Брэсцкая вобласць) 44
Камянецкі раён 70
Канстанцінаўка (Украіна) 85
Каўпыніца (в. Колас) Крупскага раёна 9
Кенігсберг 23
Кіеў (Украïна) 24,49,88
Кісялёўцы (Кобрынскі раён) 39
Клайпеда (Літва) 80
Кобрын 9,10,11,12,15,23,25,30, 38,41,43,44,46,53,57,58,68,69,73,88
Крым 85,86
Крычаў (Магілёўская вобласць) 91

**Л**енінград 12,76,88
Леснікі (Драгічынскі раён) 46
Лінова (Пружанскі раён) 73
Літвінкі (Кобрынскі раён) 93
Луганская вобласць 85
Лунінец (Брэсцкая вобласць) 90
Лясковічы (Іванаўскі раён Брэсцкай вобл.) 40
Ляхавічы (Брэсцкая вобласць) 55

**М**агдалін (Кобрынскі раён) 41,42
Магілёў 41,68,91
Мазуры (Кобрынскі раён) 55,78
Маларыта (Брэсцкая вобласць) 69
Малінаўка (Драгічынскі раён) 68
Масква 10,12,28,46,56,80
Мачулішчы (Мінскі раён) 30
Мачулішчы (Камянецкі раён) 70
Мінск 28,73,80,91,94

**Н**есебер (Балгарыя) 59
Нікалаеў (Украіна) 23
Нікопаль (Украіна) 23
Новазыбкаў Чарнігаўскай губерні 24

**О**рша 9
Осаўцы (Кобрынскі раён) 90

**П**авіцце (Кобрынскі раён) 49,66,67,68,69,71,72,73,74
Парыж 80
Патрыкі (Кобрынскі раён) 79
Пескі (Кобрынскі раён) 72,91
Пінск (Брэсцкая вобласць) 70,94
Пружаны (Брэсцая вобласць) 53,73

**Р**азань (Расійская Федэрацыя) 88,89
Рэчыца (Кобрынскі раён) 76
Румынія 12
Рыга (Латвія) 26

**С**вішчы (Жабінкаўскі раён) 53
Седльцы (Польшча) 94
Слонім (Гродзенская вобласць) 94
Стрыгава (Кобрынскі раён) 43
Суботы (Драгічынскі раён) 69
Сумы (Украіна) 10
Сходня (Хімкінскі раён Маскоўскай вобласці) 9

**Т**орез (Данецкая вобласць) 91

**У**краіна 58,69
Уладзікаўказ (Расійская Федэрацыя) 24
Урал 78
Усходняя Прусія 23

**Ф**іліповічы (Капаткевіцкі раён Гомельскай вобл.) 30

**Х**аркаў (Украіна) 12

**Ц**юменская вобласць 78

**Ч**алябінск ((Расійская Федэрацыя) 49
Чэрыкаў (Магілёўская вобласць) 91

**Я**сенкі (Тульская вобласць, Расія) 10

# ХРАНАЛАГІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК ДАТ ПРЫСВАЕННЯ ЗВАННЯ

## Званне

## «ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ ГОРАДА КОБРЫНА»

**1964 год**

Алісіевіч Фёдар Максімавіч
Сідарук Праскоўя Сямёнаўна

**1966 год**

Сандалаў Леанід Міхайлавіч

**1974 год**

Барысаў Дзмітрый Кузьміч
Падбярэзін Ілья Міхайлавіч

**1987 год**

Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч
Мілаянін Іван Фёдаравіч
Сялюк Пётр Дзянісавіч

**1997 год**

Мартынаў Аляксей Міхайлавіч

# Званне

# «ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ КОБРЫНСКАГА РАЁНА»

**2005 год**

Каранчук Павел Рыгоравіч
Сухараў Уладзімір Іванавіч

**2015 год**

Клачковіч Марыя Мікалаеўна
Кузіч Уладзімір Рыгоравіч
Мароз Іван Паўлавіч

**2017 год**

Гольцман Андрэй Міхайлавіч
Чырун Святлана Іосіфаўна

**2020 год**

Кенда Мікалай Аляксеевіч
Папроцкі Пётр Сяргеевіч

# Званне

# «ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ АГРАГАРАДКА ПАВІЦЦЕ»

**2014 год**

Заверджанец Мікалай Аляксандравіч
Крывецкі Мікалай Анатольевіч
Мігіц Васілій Мікалаевіч
Сашко Вячаслаў Васільевіч
Цюлін Уладзімір Георгіевіч

**2016 год**

Канцевіч Іван Уладзіміравіч
Цецярук Іван Мікалаевіч
Чопік Ганна Васільеўна

**2017 год**

Брышцен Мікалай Рыгоравіч

# ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ- ЗЕМЛЯКІ ІНШЫХ ГАРАДОЎ

**1967 год**

Ратайка Пётр Іванавіч - Ганаровы грамадзянін горада **Гродна**

**1969 год**

Селівонік Васіліса Сямёнаўна **-** Ганаровы грамадзянін горада **Брэста**

**1974 год**

Раманюк Іван Лявонцьевіч **-** Ганаровы грамадзянін горада **Лунінца**

**1996 год**

Меярэвіч Канстанцін Мікалаевіч - Ганаровы грамадзянін горада **Разані**

**1999 год**

Курашык Віталій Уладзіміравіч - Ганаровы грамадзянін горада **Еўпаторыі**

**2004 год**

Барысюк Мікалай Андрэевіч - Ганаровы грамадзянін горада **Байканур**

**2017 год**

Кірычук Сцяпан Міхайлавіч - Ганаровы грамадзянін **Цюменскай вобласці**

**2019 год**

Кузьміч Мікалай Пятровіч - Ганаровы грамадзянін горада **Брэста**

# АЛФАВІТНЫ СПІС ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ, МАТЭРЫЯЛЫ З ЯКІХ УКЛЮЧАНЫ Ў ДАВЕДНІК

Беларуская думка
Белорусская нива
Берестейський край
Брестский вестник
Брестский калейдоскоп
Буг. СЭЗ Брест
Вечерний Брест
Государственный контроль
Директор
Духовный вестник
Заря
Знамя юности
Камуністычная праца
Кобрин-информ
Кобрынскі веснік
Красная звезда
Краязнаўчая газета
Культура
Мастацтва
Народная газета
Народная трыбуна
Настаўніцкая газета
Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь
Наш край – Загородье
Новыя кнігі
Роднае слова
Рэспубліка
Рязанские ведомости
Сельская газета
Сельская праўда. Жабінка
Советская Белоруссия
Чырвоная змена
Экономическая газета

# ЗМЕСТ


| | |
|---|---|
| **ПРАДМОВА** | 3 |
| **ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ ГОРАДА КОБРЫНА** | 5 |
| **ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ КОБРЫНСКАГА РАЁНА** | 33 |
| **ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ АГРАГАРАДКА ПАВІЦЦЕ** | 61 |
| **ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ–ЗЕМЛЯКІ ІНШЫХ ГАРАДОЎ** | 75 |
| **ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК** | 97 |
| **ГЕАГРАФІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК** | 98 |
| **ХРАНАЛАГІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК ДАТ ПРЫСВАЕННЯ ЗВАННЯ** | 101 |
| **АЛФАВІТНЫ СПІС ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ, МАТЭРЫЯЛЫ З ЯКІХ УКЛЮЧАНЫ Ў ДАВЕДНІК** | 104 |

Даведачнае выданне

Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»

# Імі ганарыцца Кобрыншчына
## Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю

***Біябібліяграфічны даведнік***

Складальнік
Курачук Святлана Дзмітрыеўна

Камп'ютарная вёрстка С. Д. Курачук
Камп'ютарны дызайн вокладкі П. С. Грыневіч

На беларускай, рускай мовах

Надрукавана на камп'ютарна-выдавецкай сістэме
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

Вул. Маршала Жукава, 12, 225306, Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка дзяржаўнай установы культуры
«Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
E-mail: kobrinlib@gmail.com
www.krcls.by